Дзмітрый Шатыловіч ☞3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Пётр Юшкевіч ☞4

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 47 (2636) Год LI | Беласток, 19 лістапада 2006 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Сакрат Яновіч: Падабаецца мне гэты медаль. Буду на яго ўзірацца да вечара, або і даўжэй. Каб атрымаць такую ўзнагароду, трэба выпаўніць адну ўмову: трэба выжыць. Найперш трэба намучыцца, мець, як я, 70 гадоў, і цалюткую энцыклапедыю хвароб...

Прызнанне на развітанне

Пісьменнік Сакрат Яновіч і мастак-скульптар Юры Грыгарчук апынуліся сярод лаўрэатаў першай Ганаровай адзнакі „Заслужаны для Падляшскага ваяводства". У сваю чаргу скульптар Яраслаў Пэршка атрымаў узнагароду Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны „Заслужаны для польскай культуры". Мікалая Бушко, стваральніка Фестывалю царкоўнай музыкі ўшанавалі міністэрыяльным медалём „Gloria Artis".

Фота РАІНЫ СТЭФАНЧУК

Тры дні да самаўрадавых выбараў адыходзячыя ўлады Падляшскага ваяводства ўручылі заслужаным людзям культуры рэгіёна адзнакі і памятныя знакі. Маршалак Януш Кшыжэўскі (СЛД) і старшыня Сеймікa Збігнеў Кшывіцкі (таксама СЛД), пры непрысутнасці члена ўправы, які адказвае за культуру Яна Сычэўскага (СЛД) сустрэліся з каля трыццаткай творцаў, аніматараў і шэфаў ваяводскіх культурных устаноў. Прыгадаем, што ваяводскі самаўрад з'яўляецца г.зв. вядучым органам для беластоцкіх Драматычнага тэатра імя Аляксандра Вянгеркі, Падляшскай філармоніі і оперы, Ксёнжніцы — ваяводскай бібліятэкі, Падляшскага музея, Ваяводскага асяродка анімацыі культуры, Музея сельскай гаспадаркі ў Цеханоўцы, Тэатра „Вершалін" у Супраслі і Асяродка мастацтваў, культур і народаў „Пагранічча" ў Сейнах. У сустрэчы прыняла ўдзел Агнешка Адаровіч, дырэктар Польскага інстытута фільмавай культуры (віцэ-міністр культуры ва ўрадзе СЛД) ды каманда, галоўным чынам з акцёраў Беластоцкага лялечнага тэатра, якая працуе над другой часткай фільма „У Пана Бога за спіной" у рэжысуры Яцка Бромскага. Пры нагодзе адсвяткавалі 50-годдзе творчай мастацкай працы аўтара беластоцкага гімна Роберта Панка. Апрача Сакрата Яновіча і непрысутнага на ўрачыстасці Мікалая Бушко Ганаровую адзнаку „Заслужанага для Падляшскага ваяводства" атрымаў праф. Анджэй Струміла, вядомы мастак, што пражывае ў сувальскай Мацьковай Рудзе.

Маршалак Кшыжэўскі не мяшкаў пахваліцца дасягненнямі ваяводскага самаўрада на працягу апошніх чатырох гадоў.

— Гэта ж не толькі падзяка за супрацоўніцтва, але выбарчая кампанія, — заўважыла пасля „Ніве" ў кулуарах у час частавання тортам адна з аніматарак культуры.

Сакрат Яновіч быў вылучаны „за спрычыненне да кшталтавання ў грамадстве вобразу нашага рэгіёна, які з'яўляецца мяшанкай шматлікіх рэлігій, культур, грамадскасцей, якія суіснуюць тут разам і ствараюць ад вякоў". Пасля атрымання адзнакі пісьменнік з Крынак пажартаваў:

— Падабаецца мне гэты медаль. Буду на яго ўзірацца да вечара, або і даўжэй. Каб атрымаць такую ўзнагароду, трэба выпаўніць адну ўмову: трэба выжыць. Найперш трэба намучыцца, мець, як я, 70 гадоў, і цалюткую энцыклапедыю хвароб.

І звярнуўся да прафесара Струмілы:

— А ты што на гэта скажаш, Андрэю?

Прафесар выпраставаў спіну і кінуў:

— Мы яшчэ жывём!

Пасля лаўрэат Яновіч разважаў:

— Падляшша — вельмі плённае, бо культура развіваецца на скрыжаваннях. Найпрыгажэйшыя дочкі — дочкі розных бацькоў і да даго генетычна неманатонныя.

Дадаў:

— Падляшша, на клопат палякаў з глыбі краіны, гэта не толькі Касцюшка, не толькі Арэшчыха ці Сянкевіч або ксёндз Бжузка, апошні капелян паўстання. Падляшша дало таксама свету міжнародную мову — эсперанта.

Адзнаку „Ганаровага заслужанага для ПВ" назначае рада, у якой складзе апынуліся м.інш. рэжысёр Кшыштаф Рау ды сацыёлаг Андрэй Садоўскі.

У час сустрэчы-святкавання не ўзяў афіцыйнага голасу лаўрэат Яраслаў Пэршко. З'яўляецца ён разбяром родам з Гайнаўкі. Скончыў факультэт мастацтваў ва Універсітэце імя М. Каперніка ў Торуні. Рэзбіць у бронзе і камені. Атрымаў ён м.інш. першую ўзнагароду ў конкурсе на помнік „Магіла невядомага сібірака" ў Беластоку і помнік каралю Жыгімонту Аўгусту ў Кнышыне.

Не даехаў прыняць узнагароду „Gloria Artis" Мікалай Бушко. Прэс-інфарматарка маршалка Кшыжэўскага пасля тлумачыла „Ніве" прычыны, якія на яе думку паўплывалі на тое, што на старонках установы не апынулася нават слова пра гэтую ўзнагароду Мікалаю Бушко:

— Спадара Бушко ўшанавалі мы раней. Не прыехаў яе прыняць, дык мы не бачылі падстаў, каб пра гэта ўспамянуць на нашых старонках.

У час сустрэчы былі ўручаны таксама тры гадавыя стыпендыі ў галіне мастацкай творчасці, распаўсюджвання і захавання культуры. Сярод дваццаці кандыдатаў, канчаткова тройкі стыпендыстаў, не было нікога, хто прадстаўляў бы беларускае асяроддзе. Памяткі — камплекты кніг атрымалі кіраўнікі ваяводскіх цэнтраў культуры.

— За апошнія гады мы стараліся, каб побач ужо санкцыянаванага сімвала нашага прыгожага ваяводства — сімпатычнага зубра, паявіліся таксама іншыя ягоныя паказальнікі.

Маршалак атрымае з рук Агнешкі Адаровіч „дыплом прызнання за падтрымліванне польскага кінематографу і дзейнасць для справы распаўсюджвання фільмавай культуры". Каментар? *Bialywood!*

Раіна СТЭФАНЧУК

Выбары 2006

У падляшскіх гмінах, у якіх у значнай ступені пражывае беларуская меншасць, Беларускі выбарчы камітэт, Беларуска-народны выбарчы камітэт і Бельская кааліцыя не да канца могуць быць задаволенымі вынікамі самаўрадавых выбараў 12 лістапада. Да закрыцця гэтага нумара „Нівы" мы яшчэ не ведалі дакладных вынікаў выбараў у падляшскі Сеймік, хоць было ўжо вядома аб тым, што праваслаўнае асяроддзе будзе прадстаўляць там Яраслаў Матвеюк. У Гарадскую раду на БКВ прагаласавала 1 701 асоба. У беластоцкай Гарадской радзе праваслаўнае асяроддзе будуць прадстаўляць м.інш. кандыдаты ад ПО і вядомыя радныя: Марк Масальскі і Славамір Назарук.

У гміне Чыжы войтам стаў Юрый Васілюк (БНВК). У Дубічах-Царкоўных прапаў толькі з-за 20 галасоў кандыдат гэтага камітэта Міхал Андрасюк, падобна як і ў Гайнаўскай гміне кандыдат на войта Міраслаў Баравік, а ў Нарве падтрымліваная БНВК Ева Урбановіч.

Другі тур будзе праводзіцца ў Орлі, дзе ўступяць у спаборніцтва праз няпоўныя два тыдні Уладзімір Сахарчук і Пётр Сэльвесюк ды ў Чаромсе (тут было аж чатырох кандыдатаў на войта) Ежы Шыкула і Міхал Врублеўскі, а таксама ў Белавежы, дзе стануць супраць сябе Альберт Літвіновіч і Міхал Корх.

У Бельску-Падляшскім поспехам можа назваць Бельская кааліцыя вынік у выбарах у Гарадскую раду. Увяла яна туды аж сем асоб: Андрэя Сцепанюка, Раісу Іванюк, Марка Верамеюка, Алу Сасну-Паўлючук, Андрэя Рошчанку, Аляксандра Божку і Дарафея Фіёніка. У Бельску адбудзецца другі тур выбараў бурмістра. Сапернічаць будуць выконваючы дагэтуль гэтую функцыю Яўген Беразавец і прадстаўляючы БК Пётр Божка. У Кляшчэлях зноў бурмістрам стане Аляксандр Сяліцкі. А ў Гарадской радзе Гайнаўкі засядуць ад БНВК: Яўген Сачко, Пётр Маркевіч, Віктар Дзік, Валянціна Асташэўская, Рыгор Сурэль і Вера Масайла.

Падрабязнасці — праз тыдзень.

(раст)

Беларускі выбарчы камітэт у Беластоку, Беларуска-народны выбарчы камітэт у Гайнаўцы і Бельская Кааліцыя дзякуюць усім выбаршчыкам, якія прагаласавалі на спіскі нашых кандыдатаў.

9 770546 196000

Сучасныя палітыкі

Не перастаюць нас здзіўляць сучасныя беларускія палітыкі. Маю на ўвазе, канешне, не рэгіянальных грамадска-палітычных актывістаў, а тых, хто прэтэндуе на ролю агульнанацыянальных лідэраў. Ніяк яны не могуць вызначыцца, хто ж з іх адзіны і непаўторны. Хто радыкальнейшы і абаяльнейшы для народа, які цяпер так любяць называць электаратам. Усе гавораць пра маральнасць, але ніхто не пацвердзіў яе на справе. Адсюль і перацягванне коўдры на сябе, бясконцыя кангрэсы, канферэнцыі, з'езды, соймы, рады-нарады. Сяргей Калякін, Аляксандр Мілінкевіч, Анатоль Лябедзька — усе яны прэтэндуюць на ролю правадыра аб'яднаных апазіцыйных сілаў. А ёсць жа яшчэ Аляксандр Казулін, Андрэй Клімаў, Мікола Статкевіч, якія пакуль знаходзяцца ў зняволенні і таксама маюць не менш падставаў быць на чале дэмакратычных сілаў і пэўных палітычных плыняў. Але на сакраментальнае пытанне абывацеля „Дык хто ж, калі не Аляксандр Рыгоравіч?" звычайнаму апазіцыйнаму актывісту, які з году ў год у кожную сэнсавую і бяссэнсоўную выбарчую кампанію да знямогі ходзіць ад дзвярэй да дзвярэй, адказаць няма чаго. Такая вось неразвязальная праблема — улада ў нас надзвычай персаніфікаваная і нічога з гэтым не зробіш. Брак патэнцыйнага альтэрнатыўнага кіраўніка дзяржавы — вялікая праблема беларускай апазіцыі. І калі падчас прэзідэнцкай камапаніі вясной бягучага года аб'яднаныя дэмакратычныя сілы так-сяк здолелі паразумецца, то зараз у іх шэрагах назіраецца суцэльны разлад. І гэта, нягледзячы на высілкі многіх, хто сапраўды верыць у шырокую кааліцыю дэмакратычных сілаў і шчыра імкнецца рэалізаваць гэтую натуральную ідэю. Здавалася б усё проста. Неяк у невялікай сяброўскай кампаніі мы „змадэлявалі" сітуацыю выбараў адзінага лідэра на сваім прыкладзе. Праз тры хвіліны прыйшлі да высновы, што кожны з нас гатовы паставіць на кожнага без усялякіх ваганняў. Па іншаму паміж аднадумцамі ў галоўным і быць не можа. На палітычным макрароўні галоўнай каштоўнасцю мусіць быць незалежная дэмакратычная дзяржава Рэспубліка Беларусь. І калі няма паразумення, то гэта значыць, што гэтая ідэя не ёсць яднальнай для канкрэтных асобаў. Калі працягваць далей — падмурку для шырокай дэмакратычнай кааліцыі няма. Вось і атрымліваецца парадокс. Пратэстны настрой у народзе спаквалы расце, а згуртаванасці няма.

Калісьці ў Беларусі быў адзін яскравы апазіцыйны лідэр — Зянон Пазьняк. Многія яго называлі заўчасным лідэрам, маўляў, не гатовае беларускае постсавецкае грамадства пакуль успрымаць такую палітычную радыкальнасць. Афіцыйная прапаганда актыўна рабіла Пазьняка жупелам „контррэвалюцыі". Але ў той час (пачатак 1990-ых гадоў) Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне" як рух быў магутнай уплывовай сілай на палітычнай арэне краіны. Варта згадаць дэманстрацыі па восемдзесят-сто тысяч чалавек, якія праходзілі ў Мінску. Пасля прэзідэнцкіх выбараў 1994 года, БНФ больш не меў свайго кандыдата. Дакладней меў (бо ў фронту ёсць такія людзі), але не выстаўляў. Не дзіва, што ўсе, хто „прыліпаў" да руху БНФ выйграваў, а БНФ прайграваў пасля кожнай выбарчай кампаніі. Так было і ў 2001 годзе, так стала і пасля сёлетняй вясны.

Ёсць і такое меркаванне, што нацыянальнага лідэра немагчыма прызначыць — ён альбо ёсць, альбо яго няма. Вельмі важна, каб у гісторыі кожнага народа лідэр прыходзіў у патрэбны час. Прыкладам, такімі „учаснымі" палітыкамі сталі Вацлаў Гавэл для Чэхіі, Лех Валэнса для Польшчы, Вітаўтас Ландсбергіс для Літвы. Выканаўшы сваю гістарычную місію, яны адышлі ад вярхоўнай улады. Сярод жа сучасных апазіцыйных палітыкаў Беларусі такой „учаснай" асобы, здаецца, не праглядваецца. А, значыць, спадзевы на перамены ў краіне можна звязваць толькі з тымі палітыкамі, якіх „вынясе хваля".

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Што нас чакае?

Нядаўна гаварылі мы як гадкі і драпежны капіталізм, пад уздзеяннем не менш гадкай Кастрычніцкай рэвалюцыі, савецкай дзяржавы і сацыялістычнага лагера пазней пачаў памаленьку мякчэць, пазбаўляцца празмернай гадкасці ды набываць людскі твар. І ўрэшце крыху ачалавечыўся. Ад гэтага і працоўны народ капіталістычных краін, і самі капіталісты толькі выйгралі. І выйгралі яны ў канфрантацыі з нерэфармавальным савецкім сацыялізмам. Такім пераможцам укрочыў капіталізм у дваццаць першае стагоддзе, а па Савецкім Саюзе і сацыялістычным лагеры асталіся толькі сумныя ўспаміны...

А як маюцца капіталізм і капіталісты цяпер, калі ўжо перастаў вісець над імі меч савецкага сацыялізму ў выглядзе Савецкага Саюза? І якія перспектывы ў іх, і тым самым ва ўсіх нас?

Па ўсім відаць, што і капіталісты, як старыя — капіталістычныя, так і новыя — сацыялістычнай гадоўлі, і капіталізм, маюцца вельмі добра. І перспектывы, здаецца, цудоўныя ў іх. Тэрытарыяльна капіталістычная сістэма хутка пашыраецца, а „господа" капіталісты яшчэ больш узбагачаюцца. Мільянеры становяцца мільярдэрамі, менш маёмныя капіталісты арганізуюцца ў магутныя карпарацыі — і таксама някепска ім. Капіталы адных і другіх хутка растуць і ўмацоўваюць сваю імперыю. Хутка ўся наша планета і нават космас можа стаць прыватнай уласнасцю капіталу. Маем ужо Еўрасаюз, глабалізацыю. Напэўна паявяцца і іншыя геаграфічна-адміністрацыйныя навінкі — і ўсяму тут бацькам — капітал. А капітал — як вядома — заўсёды быў першапрычынай канфліктаў, войнаў, бед і няшчасцяў, бо такая ўжо натура капіталу. Інакш кажучы, капітал — гэта д'ябальскі інструмент для нішчэння чалавечнасці (боскасці, калі хочаце), значыць, і чалавецтва. Красамоўным пацвярджэннем таму з'яўляецца ўся знаная нам многавяковая гісторыя чалавецтва...

Нас аднак цікавіць не так гістарычнае мінулае, як наша будучыня. Што яна прынясе нам? Якім будзе наш капіталізм і якія сюрпрызы чакаюць нас? Ці вернецца ён да сваёй мінулай драпежнасці, ці захавае чалавечае аблічча, набытае пазней?..

Ужо цяпер выразна відаць пэўныя некарысныя тэндэнцыі ў нашым капіталізме. Адна з найгоршых з іх — беспрацоўе. На абочыне жыцця астаецца немалая частка нашага грамадства і не надта турбуе гэта нашыя ўлады. Для абслугоўвання і абароны капіталістаў, іх магутных капіталаў і сучаснай гаспадаркі патрабуюцца цяпер толькі добра адукаваныя і фізічна здаровыя людзі. І патрабуецца іх не так ужо многа. А што тады з рэштай?!.

Часценька наракаюць нашы ўлады на сваіх пенсіянераў, што іх замнога і задорага яны каштуюць наш бюджэт. Інакш кажучы, задоўга жывуць халеры. Нават у адной перадачы з удзелам дашкольнікаў на тэму: дзеці аб сваіх бабулях і дзядулях, адзін малыш сазаў: „Oni żyją z naszych podatków".

Відаць, каб паправіць „імідж" пенсіянераў, нашы ўлады хочуць павысіць пенсіённы ўзрост да 65-67 год і зраўняць яго для мужчын і жанчын. Да таго ж фінансы на лекарскую апеку над пенсіянерамі з кожным годам усё абмяжоўваюць і абмяжоўваюць... Такім арыгінальным спосабам яны вырашаць адразу дзве важныя праблемы: колькасць пенсіянераў будзе хутка скарачацца, а іх папулярнасць у грамадстве расці. Як занікаючы від...

Наступная справа — школьніцтва. Яшчэ не так даўно яно было ў нас адно для ўсіх. Калі дзесьці і паяўляліся зрэдку нейкія прывілеяваныя школкі, то гэта было хутчэй выключэннем, як правілам. Пра іх нават гаварылі з нейкім сорамам.

А цяпер?! Цяпер падзел на школьніцтва і элітарнае школьніцтва стаў модай і правілам. Розніцы ж паміж школамі „имущих" і школамі „неимущих" значныя цяпер. Значыць, і жыццёвыя шанцы, якія дае школа дзеткам высокіх чыноўнікаў і бізнесоўцаў куды большыя ад шанцаў, якія дае школа дзеткам рабочых ці сялян з нейкай там Галяковай Шыі ці Гайнаўкі. Нават калі яны вундэркінды ў іх, не гаворачы ўжо пра дзяцей беспрацоўных...

Так маюцца справы ў нас і нават у багатых заходніх краінах. І, думаю, яны будуць нарастаць і наступіць далейшае расслаенне грамадства, бо такая натура ў капіталізму. А баяцца капіталістам, і таму прыкідвацца добранькімі, ужо няма каго. Савецкі сацыялізм зжыў сам сябе і напэўна ўжо не адродзіць яго ні Зюганаў, ні Лімонаў, ні іншыя спецы. Ужо хутчэй, на маю думку, адродзіцца фашызм...

Васіль САКОЎСКІ

Вачыма еўрапейца

Мы выбіралі

Якраз завершаная самаўрадавая выбарчая кампанія прабягала адносна марудна. Нават інцыдэнты, парушаючыя выбарчую цішу, былі спарадычныя і — як сцвердзіла Дзяржаўная выбарчая камісія — невялікага калібру, такія, як аплакатаванне выбарчымі плакатамі трамваяў, што ездзілі ў час гэтай цішы па Вроцлаве і Шчэціне. На Падляшшы выбіралі мы больш за 2 100 радных, 33 бурмістраў, 82 войтаў і 3 прэзідэнтаў.

— Я не ведала аб кандыдатах. А ведала адно столькі, колькі ўбачыла ў тэлебачанні ці прачытала ў прэсе, — сказала пасля выхаду з аднаго з выбарчых участкаў у Беластоку адна з беластачанак.

Пры нагодзе выбараў пераглянуў я лістоўкі падляшскіх кандыдатаў з выбараў чатыры гады таму. І што? У лозунгах і абяцаннях няшмат адрозніваліся яны ад сёлетніх. Большасць кандыдатаў хацела змагацца з маразмам і застоем Беластока ды намерваласяпаменшыць дыстанцыю, якая дзеліць Падляшша з яго сталіцай ад рэшты краіны. Раней і цяпер запэўнівалася аб усчаццi барацьбы з беспрацоўем, аб стварэнні шанцаў маладым і пачуцця бяспекі старэйшым. Кандыдаты ў радных, войтаў, бурмістраў і прэзідэнтаў давалі слова, як гэта яны будуць расходаваць еўрасаюзныя грошы галоўным чынам на развой інфраструктуры. Шмат з сягаючых па самаўрадавыя мандаты ў Беластоку запэўнівала, што дапільнуюць пабудовы лётнішча на Крыўлянах і разбудовы маркета-галерэі Ягелоніі. Абяцалі таксама абмежаванне руху міжнародных грузавікоў на падляшскіх дарогах.

Несумненна, рысай, адрозніваючай выбары 2006 г. было іх выключнае напалітычненне. Найбольшыя кампаніі (найбагацейшыя і найшырэй задуманыя) вялі партыі. Найбольш тыя, што засядаюць сёння ў Сейме. На пальцах адной рукі ў маштабе ўсяго рэгіёна можна было пералічыць нізава пакліканыя выбарчыя камітэты, якіх кандыдаты не спасылаюцца на палітычна-партыйнае заплечча. Адным з нешматлікіх вылучэнняў быў тут без сумнення Беларускі выбарчы камітэт разам з Беларускана-народным ВК і Бельскай кааліцыяй. Нават найважнейшыя праваслаўныя кандыдаты ў беластоцкую Гарадскую раду, якія засядалі тут раней: Яраслаў Матвеюк і Марк Масальскі балатаваліся са спіскаў лявіцы і Грамадзянскай платформы.

Вось цікавінкі. Кур'ёзным рухам аказаўся старт у гэтых выбарах члена ваяводскай Падляшскай управы Караля Тыленды. Чатыры мінулыя гады ён прадстаўляў інтарэсы СЛД-ПСЛ — групоўкі, на практыцы кіруючай ваяводствам і апазіцыйнай да кіруючага краінай ПіС. Займаўся ён м.інш. супрацоўніцтвам з чыгункай (памятаюць аб гэтым, пэўна, жыхары Чаромхі) і пабудовай беластоцкага аэрапорта. Сам ён на пачатку гэтага тэрміну быў членам Самаабароны і якраз ад гэтай групоўкі ўвайшоў у Сейм. Пасля выкінуў яго з партыі Анджэй Леппэр, і Тыленда здэкларавуся як незалежны. Хваліўся ў сваёй кампаніі дасягненнямі ў левіцова-народнай управе, хоць не называў яе па партыйным імю. Стартаваў у выбарах 2006 г. як кандыдат ад... Права і справядлівасці. Лепшая кан'юнктура?

І на канец, у рамках гэтага агульнага агляду па прычыне аб'ёму „Вачэй": тым, хто гэтага не прыкмеціў, а на памяць на будучыню аб мінулым: кандыдат у ГР Беластока, адзін журналіст, якога прэсавым аўтарствам быў намёк аб злачыннай дзейнасці Праграмнай рады тыднёвіка „Ніва", стартаваў у выбарах пад лозунгам: На варце прыстойнасці. У выбарчай лістоўцы напісаў ён таксама адважна, як калісьці ў артыкуле Popłynęło z „Niwą": Калі атрымаю Вашу падтрымку, застануся верным сваім прынцыпам. А я яшчэ да 12 лістапада пытаўся: а калі спадар журналіст не атрымае тае падтрымкі, дык што будзе з гэтымі ягонымі прынцыпамі?

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Бачыў, будаваў, пішу...

Размова з Дзмітрыем ШАТЫЛОВІЧАМ у васьмідзесяцігоддзе.

„Ніва": — Раскажыце пра свой прафесійны шлях.

Дзмітрый Шатыловіч: — Мой прафесійны шлях пачаўся, ў студзені 1954 г. калі я вярнуўся з Ленінграда з дыпломам магістра інжынера электрыка-аўтаматыка. У Міністэрстве вышэйшай адукацыі далі мне загад працы ў Варшаўскім бюро праектаў гідраэлектрастанцый. Мелі мяне выслаць у Новую Гуту пад Кракавам, аднак калі даведаліся, што я зрабіў дыпломную працу па дыстанцыйным кіраванні 12 малымі гідраэлектрастанцыямі з аднаго пульта кіравання, пакінулі мяне ў Варшаве. З 1 сакавіка пачаў я працаваць у гэтым бюро асістэнтам праекціроўшчыка. Я там зрабіў толькі адзін праект, звязаны з электрычнай часткай малой гідраэлектрастанцыі ля Плоцка, якую, аднак, не пабудавалі, і перавялі мяне ў Бюро энергетычных праектаў, якое размяшчалася ў тым самым будынку па вуліцы Кручай, 6/14.

Мяне накіравалі ў праектную групу пры будове цеплацэнтралі ў Варшаве, у квартале Жэрань. Праект, генератары магутнасцю ў 25 тысяч кілават, трансфарматары і іншае машыннае абсталяванне было прывезена з Савецкага Саюза. Мяне перавялі туды таму, што я добра ведаў рускую мову і лёгка даваліся мне пераклады савецкіх праектаў на польскую мову. Рабіў я гэта пасля працы за дадатковую плату. Адначасова я там вучыўся, пазнаваў тэхніку. Калі кіраўніка праектнай групы назначылі генеральным праекціроўшчыкам, мяне паставілі кіраўніком праектнай групы. Я там працаваў да мая 1955 г. Пасля я атрымаў пасаду праекціроўшчыка і быў накіраваны ў праектную групу праектаваць электрастанцыю Конін. Праект для гэтай электрастанцыі рабіла бюро ва Усходнім Берліне на нямецкай мове, з прымяненнем нямецкай апаратуры. Прыйшоў загад зверху, каб іх праекты перарабіць на польскую мову і прымяніць тадышнюю польскую апаратуру. Тады выслалі мяне, з групай праекціроўшчыкаў, у нямецкае бюро праектаў ва Усходні Берлін з мэтай прагледзець іх праекты і ўзяць іх. Берлін тады яшчэ не быў падзелены муром і можна было перайсці ў заходнюю частку горада. Выслалі мяне таму, што я ведаў нямецкую мову, якой я авалодаў у час акупацыі ва Усходняй Прусіі, куды мяне немцы ў 1943 годзе вывезлі на прымусовую працу. Калі пачалі будаваць электрастанцыю Конін, я там часта аставаўся на аўтарскім наглядзе. Дырэкцыя электрастанцыі прыняла мяне на паўстаўкі інжынера амаль на два гады. Прыязджаў я туды амаль кожны тыдзень на два-тры дні. З 1959-1960 гг. праектаваў я электрычную частку аўтаматыкі на электрастанцыі Туруў ля Багатыні на блоках 200 тыс. квт. і на фабрыцы сінтэтычных матэрыялаў у Вроцлаве і часта туды ездзіў на аўтарскі нагляд. Пасля праектаваў я аўтаматыку на электрастанцыях Понтнуў і Козеніцэ з блокамі 500 тыс. кілават.

З 1972 г. праектаваў я цеплацэнтраль у Югаславіі ля баснійскага горада Тузла і быў там у 1974 г. амаль пяць месяцаў на аўтарскім надзоры. Жыў я там у гасцініцы „Брыстоль".

Я праектаваў часткова аўтаматыку і ў іншых электрастанцыях і цеплацэнтралях, такіх як Кола, Астралэнка, Сякеркі ў Варшаве, а з 1982 г. у Бакаро ў Індыі і з сакавіка 1986 па ліпень 1988 г. быў я там на аўтарскім наглядзе ў якасці кіраўніка праектнай групы.

Калі я вярнуўся з Індыі, то да пераходу на пенсію праектаваў электрастанцыю Бэлхатуў, недалёка ад Пётркава-Трыбунальскага.

За праектную працу атрымаў я Сярэбраны і Залаты крыжы заслугі і Кавалерскі крыж Ордэна Адраджэння Польшчы і іншыя медалі.

У 1975 г. я здаў экзамены на гіда замежных экскурсій і пасля ў Турыстычным бюро „Орбіс" у час водпуску ездзіў з польскімі турыстычнымі групамі на замежныя экскурсіі. У сувязі з тым, што я — ветэран-франтавік, я меў на 10 дзён больш водпуску: адзін месяц і 10 дзён у год.

— ***Які адбітак знайшло гэта ў Вашай творчасці?***

— Прафесійны шлях у праектным бюро меў невялікі ўплыў на творчасць, ён бадай перашкаджаў, бо забіраў шмат часу, які я мог бы прысвяціць творчасці. Толькі прафесійныя выезды ў Тузлу і ў Індыю знайшлі свой адбітак у маёй творчасці. Я напісаў некалькі вершаў, будучы ў Індыі. Там быў у мяне час на экскурсіі і пісанне вершаў.

У творчасці многа памаглі мне замежныя экскурсіі ў якасці гіда турыстычных груп. Выезды ў Турцыю, Грэцыю, Балгарыю, на Каўказ знайшлі свой адбітак у многіх маіх вершах, якія ўвайшлі ў першы мой зборнік *Эцюды падарожжа*. Пасля вершы з Індыі ўвайшлі ў зборнік *Хвалі часу*.

У Францыю я паехаў з жонкаю і дачкою ў 1975 г. па запрашэнні жончынай сваячкі. Яна праз Літву ўцякла ад бальшавікоў у 1939 г. у Югаславію, а пасля з Югаславіі ў Францыю. Жыла яна недалёка Альбі ў паўднёвай Францыі. Пры выездзе ў Францыю, а пасля ў Заходнюю Германію ніхто ні мне, ні маёй жонцы не прапанаваў супрацоўніцтва, ніхто не жадаў ад нас пісаць справаздачы з нашых выездаў. І таму ні мяне, ні маёй жонкі няма ў спіску Вільдштэйна.

— ***Увекавечыць красу часу, красу жанчыны, красу жыцця — я б так спрабавала абагуліць матывы Вашай творчасці. Што было найбольшым імпульсам для таго, каб узяць за пяро?***

— Я яшчэ ў шостым і сёмым класах Беларускай няпоўнай сярэдняй школы ў Бельску-Падляшскім напісаў некалькі вершаў, бо заахвоціла мяне да гэтага наша настаўніца беларускай і рускай моў. Я напісаў, яна зрабіла карэктуру і вершы паказаліся ў насценгазеце і гэта было прыемна. Пасля сам стаў пісаць для сябе ў сшытак, а многія сяброўкі прасілі мяне напісаць верш ім у альбомы. Многія вершы таго часу загінулі, некаторыя ўцалелі. Калі быў я ў Беларускай гімназіі ў 1946 г., заахвоціў мяне напісаць верш у насценгазету Віктар Швед, бо мае сябры з Чаромхі сказалі яму, што я часам пішу, і калі ў 1956 ці 1957 г. я купіў у Варшаве „Ніву" і там заўважыў верш Віктара Шведа, то і я рашыў паслаць туды свой верш. Калі знайшоў я мой твор на старонках „Нівы", уцешыўся і пачаў далей пісаць. На жаль, тады ў мяне было вельмі мала часу і меў я цяжкасці з беларускай мовай. Цяпер я на пенсіі, маю больш часу і памагаюць мне камп'ютэр і Інтэрнэт. Таму цяпер больш пішу.

— ***Балела Вас тое, што бомбы разваліли тое, што Вы стварылі. Бомбы разбілі Вашу працу ў югаслаўскай Тузлі. Вы за сваё васьмідзесяцігадовае жыццё былі сведкам падзей свайго часу. Між іншым — не адной бяды і вайны.***

— Я трынаццаць гадоў жыў на вёсцы пры былым польскім капіталізме. Бачыў бяду сялян і не толькі іх. Восенню, зімой і вясной у вёскі прыходзілі дзесяткі беспрацоўных і солтыс размяркоўваў іх паміж сялян, якія давалі ім на вячэру бульбяны суп і начлег на саломе на падлозе, а ранкам, пад'еўшы супу, ішлі яны ў наступную вёску. Прыходзілі часта хворыя, кашлялі кроўю. На вёсцы людзі таксама жылі вельмі бедна. Былі дамы, дзе замест падлогі быў гліняны ток, хаты былі пераважна крытыя саломай. Сяляне рэдка хадзілі да лекара, у школах вучыліся толькі да чацвёртага класа.

Потым пачалася вайна. Бачыў я як нямецкія самалёты бамбілі чыгуначную станцыю ў Чаромсе, як гарэла ад бомб вёска Кузава.

Саветы пачаткова заахвоцілі сялян вучыцца, а пасля змушалі людзей плаціць вялікія падаткі, выганялі іх працаваць у пушчы ці пры мяжы, пачалі сялян вывозіць у Сібір, арыштоўвалі.

І зноў акупацыя — мяне вывезлі на прымусовую працу ва Усходнюю Прусію. Я меў шчасце, што толькі тры месяцы там галадаў, да часу, як мяне ўзялі капаць акопы, адкуль я ўцёк. Потым фронт, вайсковы шпіталь і блуканне да студзеня 1946 г. Таму я так ненавіджу вайну.

Я меў шчасце, што пры новым капіталізме пайшоў на пенсію і не баюся беспрацоўя. Непрыемна глядзець, як людзі прыходзяць і чагосьці шукаюць у сметніках, а часта ноччу там спяць. Сустрэўся я з рабаўнікамі ў сваім пад'ездзе.

— ***Вы — адзін з найбольш плённых „белавежцаў". Колькі кніг Вы запрапанавалі чытачу і якія ў Вас планы?***

— Я не найбольш плённы „белавежац". Многа ёсць лепшых за мяне. Пакуль я выдаў сем зборнікаў: *Эцюды падарожжа*, *Маё Падляшша*, *Хвалі часу*, *Вясёлка над імглою*, *Струмені лёсу*, *Rezonanse pamięci*, *Асеннія промні*. У наступным годзе, калі здароўе будзе, хачу выдаць восьмы зборнік. Ужо ён амаль гатовы. А далей — пабачым.

— ***Дзякуем за размову і жадаем Вам здароўя, радасці і поспехаў на прыватным і творчым шляху на наступныя гады.***

Размаўляла Міра ЛУКША



ZLP

Związek Literatów Polskich

Zarząd Główny
Krakowskie Przedmieście 87/89 00-079 Warszawa
Tel. 826 57 85 tel/fax 828 39 19, owzlp@o2.pl

Warszawa, listopad 2006 r

Szanowny Pan
Dymitr Szatyłowicz

Szanowny Jubilacie!

Jest dla mnie prawdziwym zaszczytem i przyjemnością, że mogę złożyć Panu w imieniu Zarządu Głównego gratulacje z powodu Pańskiego pięknego Jubileuszu.

Proszę przyjąć najlepsze życzenia dobrego zdrowia, długich lat życia i wielu jeszcze świetnych książek, na które — jestem o tym przekonany - czekają Pańscy czytelnicy.

Z wyrazami prawdziwego szacunku -

PREZES
Związku Literatów Polskich
Marek Wawrzkiewicz

ДЗМІТРЫЮ ШАТЫЛОВІЧУ

У Васьмідзесяцігоддзе

Дарагі мой Дружа Дзіма
Я з Табой наяве, у снах.
Маю заўжды прад вачыма
Пройдзены супольна шлях.

Я ў мірным сорак пятым
Пазнаёміўся з Табой.
Мы вучыліся заўзята
У Бельскай школе дарагой.

Разбрыліся мы па свеце
У пасляваенны час.
Закахаліся ў асвеце,
Акрыляў нас і Пегас.

Лёс адзінкі — невядомы.
Пасля некалькіх гадоў
У Варшаве, у адным доме
Апынуліся ізноў.

Ты аднак, як энергетык,
Працаваў шмат за мяжой,
І як гід звычайна гэтак
Вандраваў з таўпой людской.

І заўсёды з падарожжаў,
З краін і мацярыкоў,
Добрых вершаў шмат прывозіў
Экзатычных, пра любоў.

Калі стаў пенсіянерам,
Жывеш творчасцю найперш,
У Пегас не страціў веры,
Пішаш і шліфуеш верш.

У Васьмідзесяцігоддзе
Пажадаю ад душы:
Жыві доўга, ну і штодзень
Вершы надалей пішы!

Віктар ШВЕД

Перадаў у музей

Амаль усё мінае, як ранішняя раса. Калі я быў малы, рака Белая, каля якой жыла тады наша сям'я, несла чыстую ваду пад высокім берагам, а цяпер яна зарасла разухою і граззю. У даўні час бацька забіраў мяне на раку, дзе ён віламі лавіў шчупакоў, што выплывалі пагрэцца на сонейку; тады шчупакі былі як рука, доўгія на семдзесят сантыметраў. Тады ў Белай было многа рыб, бо і льнозавод сваіх нечыстотаў не выліваў непасрэдна ў рэчку. І ракі тады былі ў Белай вялікія, як бацькава далонь.

Гэта прамінула, калі мы пераехалі ў Відава, каб выгадней жыць. Але бацька забраў з сабою ўсе тыя прылады, якімі ён карыстаўся раней. А калі ён памёр, я ў сенях зрабіў такі музей: на сценах павешаў усе прылады хатняга карыстання, а ступу, жорны, кросны, снавалку пакінуў у каморы, бо завялікія былі. Калі ў 1976 годзе стаў я пісаць у „Ніву", пазнаёміўся я з многімі беларусамі, якія цанілі роднае. Пазнаёміўся я і з цудоўным чалавекам, намеснікам старшыні Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства Канстанцінам Майсенем, які арганізаваў беларускі музей у Гайнаўцы. Тады я займаўся ў драмгуртку „Парнас" у клубе Бельскага аддзела БГКТ і сказаў Ані Бжазоўскай, што свае колішнія прылады хачу здаць у Гайнаўскі музей. Спадарыня Аня дамовілася са спадаром Майсенем і яны 28 красавіка 1988 года прыехалі грузавіком на мой панадворак.

Загрузілі мы тады на грузавік бочачку, у якой мама калісь квасіла капусту, дзве газавыя лямпы

без шкла, серп, два старыя драўляныя бёрды і адно новае, сякеру, два рэшаты, два шавецкія капылы, трапло, дзве ступы, шпулькі для снавання, калаўротак, камплектныя прыгожыя кросны, тры гліняныя збаны, лічыльнікі ўласнаручна зробленыя бацькам, дзве рыдлёўкі для торфу, два прасы на драўнінны вугаль, вілы для стаўляння саганоў з вадою ў нагрэтую пасля выпечкі хлеба печ, каб і вада нагрэлася і рана цёплай была; а калісь мы куплёнага хлеба, іншага чым выпечаны ў хатняй печы, і не ведалі...

Усе згаданыя прылады завезлі мы ў Гайнаўку, у будучы Музей і цэнтр беларускай культуры. Не ведаю я цяпер, што далей з маімі экспанатамі, ці яны прыдаліся.

Вестка пра смерць Кастуся Майсені, выдатнага беларускага дзеяча, стваральніка Музея і цэнтра беларускай культуры, глыбока мяне забалела. Шчыра спачуваю ягонай жонцы Анастасіі ды ўсім родным і блізкім пакойніка. Няхай лёгкай будзе прыняўшая Яго наша зямля.

Андрэй ГАЎРЫЛЮК

У пакоі Пятра Юшкевіча стаяць дзве старыя гітары, а ў футляры ляжыць скрыпка. На сценах красуюцца шматлікія дыпломы за поспехі на музычнай ніве....

Жыццё з музыкай

Пётр Юшкевіч са Збуча, які нядаўна адзначыў 90-годдзе з дня нараджэння, толькі ў гэтым годзе развітаўся з беларускім калектывам Гайнаўскага дома культуры. Спачатку ў ім спяваў, а пасля многа гадоў іграў на скрыпцы. Музыкай цікавіўся ён з дзяцінства. Любіў іграць на скрыпцы і гітары, ахвотна спяваў царкоўныя і свецкія песні. У міжваенны перыяд і пасля вайны іграў у Збучы і навакольных вёсках на забавах і сямейных мерапрыемствах, а ў сямідзесятых гадах заснаваў у сваім сяле калектыў. У царкоўным хоры Чыжоўскага прыхода спяваў з дзяцінства, а пасля нейкі час ім кіраваў.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Пётр Юшкевіч з дзяцінства іграе на скрыпцы

У пакоі Пятра Юшкевіча стаяць дзве старыя гітары, а ў футляры ляжыць скрыпка. На сценах красуюцца шматлікія дыпломы за поспехі на музычнай ніве. Самую высокую ўзнагароду „Заслужаны дзеяч культуры" спадар Пётр атрымаў у 1997 годзе. Спачатку мой суразмоўца іграе на гітары, а пасля дэманструе сваё музычнае майстэрства на ўлюбёнай скрыпцы.

— Ужо рукі не працуюць як трэба і пальцы становяцца драўлянымі, — з сумам заяўляе спадар Пётр. — Раней я ніколі не думаў, што пальцы страцяць сваю гібкасць. Яшчэ вясной гэтага года выступаў я ў Гайнаўцы з калектывам ГДК і гэта быў канец маіх выступаў са скрыпкай перад шырокай публікай. Не адрокся я толькі ад царкоўнага спеву, з якім сябрую з дзяцінства.

Скрыпка паявілася ў доме Юшкевічаў у Збучы ў дзяцінстве спадара Пятра. Яго бацька, Ілья Юшкевіч, кіраваў царкоўным хорам у Чыжах і карыстаўся скрыпкай пры распрацоўцы мелодый песнапенняў. Пётр Юшкевіч пачаў вучыцца іграць на скрыпцы, будучы хлопчыкам, але калі стаў падрастаць, яго больш зацікавіла гітара.

— У міжваенны перыяд на гітары іграліі браты Ян і Грыша Чабаі з Новага Беразова. Мяне такая ігра вельмі захапляла. Прыязджалі яны ў Збуч да дзядзькі іграць на сямейных мерапрыемствах. Калі мне было 18 гадоў, я сам зрабіў сабе гітару. Якуб Сапяжынскі са Збуча ўмеў строіць гітару і ён канчаткова дастройваў мой інструмент. Дзве мае саматужныя гітары я прадаў, а адну пакінуў сабе. Іграў я на ёй у вольны час свецкія мелодыі, а на скрыпцы найчасцей іграў я царкоўныя мелодыі, — расказвае Пётр Юшкевіч. — Брат маёй жонкі, Анатоль Цімашук, праз Савецкую Армію трапіў у Расію і адтуль у 1952 годзе прывёз мне сапраўдную гітару.

Покі Пётр Юшкевіч атрымаў расійскую гітару, на скрыпцы іграў на сямейных мерапрыемствах і забавах.

— Пасля вайны я іграў з гарманістам Уладзімірам Мураўскім з Орлі. Найчасцей нас наймалі ў Збучы, Кашалях і Шчытах, — успамінае спадар Пётр. — Перад вайной здаралася, што запрашалі мяне іграць на скрыпцы і тады я наймаўся з гарманістам Янам Трашчоткам са Старога Беразова.

Пётр Юшкевіч цікавіўся не толькі свецкімі песнямі. Хадзіў ён на багаслужбы і спяваў у царкоўным хоры Чыжоўскага прыхода.

— Хорам у Чыжах кіраваў мой брат, айцец Рыгор Юшкевіч. Быў ён самавукам, а святаром стаў пры нямецкай акупацыі, — тлумачыць спадар Пётр.

Пётр Юшкевіч у сямідзесятых гадах заснаваў вакальны калектыў у Збучы. Хаця сам гаспадарыў на шасці гектарах і займаўся жывёлагадоўляй, знаходзіў час на музыку і выезды на канцэрты.

— Гэта Аляксандр Лукашук з Гайнаўскага дома культуры запрапанаваў нам заснаваць у Збучы калектыў. Я іграў на гітары, а мой брат Косця і чатыры жанчыны спявалі. Аднак мы дзейнічалі коратка, толькі каля года часу. За гэты перыяд паспелі мы выступіць у Беластоку, Гайнаўцы і Нараўцы, — гаворыць Пётр Юшкевіч. — Пазней дырэктар Гайнаўскага дома культуры Мікола Бушко запрапанаваў мне спяваць у гайнаўскім калектыве, якім кіраваў тады Аляксандр Лукашук. Спачатку я спяваў з гайнавянамі, а пасля пачаў іграць у калектыве на скрыпцы.

Жыхарам Гайнаўкі і шырокай публіцы беларускіх мерапрыемстваў вядомы старэйшы чалавек са скрыпкай, які разам з іншымі членамі капэлы ГДК акампаніявалі беларускаму калектыву.

— Калектыў ГДК выступаў толькі з беларускімі песнямі. Хаця я ўмею карыстацца нотамі, то ў гайнаўскім калектыве іграў я па слыху, — кажа Пётр Юшкевіч. — Добра ўспамінаю перыяд, калі разам з гайнаўскімі спевакамі ездзілі мы на розныя мерапрыемствы. Спачатку на рэпетыцыі дабіраўся я са Збуча на аўтобусе, а пазней заязджаў за мною Коля Сідарук з Ягуштова. Пасля выступленняў прыходзілася начаваць у Гайнаўцы ў дачкі.

Пётр Юшкевіч кіраваў таксама царкоўным хорам у чыжоўскім храме.

— Мне прыйшлося кіраваць царкоўным хорам у дзевяностых гадах. Калі не было нотаў, я іх перапісваў уручную, — кажа Пётр Юшкевіч і паказвае мне свае сшыткі. — Я быў самавукам, але знаўся на нотах і рабіў копіі, якімі пасля карысталіся харысты.

Скрыпку, на якой зайграў для мяне спадар Пётр, купіў ён у Малочках, а найстарэйшы інструмент астаўся ў сям'і ягонага брата. У пакоі, у якім мы размаўляем, стаіць таксама піяніна.

— Піяніна купіў я дачцэ Ірэне. Вучылася яна ў музычнай школе ў Беластоку, а пазней на піяніна іграла мая ўнучка Іаанна, якая таксама закончыла музычную школу. Пасля выехалі яны ў Бельгію і асталіся там жыць, — кажа спадар Пётр. — Чатыры гады таму памерла мая жонка Марыя. Аднак дзеці і ўнукі не забываюць мяне адзінокага.

У апошніх гадах Пётр Юшкевіч наведвае цэрквы ў суседніх прыходах.

— Я ахвотна заязджаю на прыхадскія святкаванні ў суседнія мясцовасці, а там мяне запрашаюць спяваць у царкоўным хоры, — гаворыць мой суразмоўца. — Апошнім часам я найчасцей спяваў у хоры ў Шчытах. Запрасілі мяне таксама спяваць у царкве ў Новым Беразове.

Дома спадар Пётр іграе ўлюбёныя мелодыі.

— Сённяшнія песні меладычныя. Можна іх спяваць і пад іх танцаваць. У мінулым інакш было, песні былі больш сентыментальнымі і лепш было выконваць іх на музычных інструментах, — разважае ў канцы нашай гутаркі спадар Юшкевіч.

— Пётр Юшкевіч увесь час жыве музыкай, — скажа пасля сусед майго субяседніка. Вяскоўцы са зразуменнем успрымаюць зацікаўленні музычнага энтузіяста.

Аляксей МАРОЗ

Сезонная вёска Гураны

У Гураны, што ў Крыноцкай гміне, складана дабрацца з Беластока на публічным транспарце, таму і з'яўляюся ў вёску адносна пазнавата. У пачатку вёскі, што ад Новага Вострава, паўстае нешта накшталт палаца з класічнымі калонамі абапал галоўнага ўвахода. За шчыльнай агароджай будучага хорама бегаюць байкаватыя сабакі...

Нягледзячы на пазнаватую пару Гураны здаюцца быць соннымі, прысутнымі целам, але адсутнымі духам. Сама вёска прыгожая, быццам казачная спячая каралева. Хаты тут традыцыйныя, дбайна абабітыя шалёўкай і памаляваныя, на большасці якіх красуюцца дахі з новай бляхі. І дагледжаныя яны, хаця ў вёсцы не відаць адзнак большага руху. Мо таму не пракладзены сюды асфальт, з усіх бакоў дарогі жвіровыя, нават невялікая частка брукаванай вуліцы пад гравіем... Толькі даходзячы недзе да сярэдзіны вёскі ўдаецца мне ўбачыць дзвюх пажылых жанчын у глыбі панадворка. Адна з іх акурат выносіць з садка кошык яблык у сваю хату, а гаспадыня праводзіць яе да веснічак...

Жанчыны не надта схільныя гутарыць з незнаёмым прышэльцам. Выкручваюцца ад размовы сваёй пажыласцю, што яны нічога цікавага не ведаюць. Але і я не хачу адступацца ад іх, бо невядома, ці каго яшчэ ў гэтай велікаватай, але надта ж соннай вёсцы спаткаю. Бо солтыс, як паведамляюць жанчыны, паехаў афармляць нейкія справы ў Крынкі. Дарэчы, адна з іх забірае яблыкі і папросту адыходзіць.

Гураны, па сутнасці, цяпер ператварыліся ў сезонную вёску, больш заселеную ў летні перыяд, а ранейшыя, па-за сезонам пустыя, хаты сталі загараднымі дачамі мясцовых выхадцаў у Беласток або Саколку. Зімуе тут яшчэ каля сотні душ. Земляробствам тут, на практыцы, сяляне перасталі займацца. Большасць навакольных угоддзяў абрабляе селянін з Геранімова, што каля Міхалова. Адзін мясцовы селянін трымае некалькі кароў, малако ад якіх возіць у Новы Востраў. Адна жанчына трымае дзве каровы, але малака для прамысловай прадукцыі не здае, толькі прадае суседзям. Яшчэ двое коней трымаецца ў Гуранах.

За вёскай стаіць фермерны пасляпэгеэраўскі комплекс; сёлета ён пуставаў, а ў мінулым годзе нейкі вонкавы прадпрымальнік трымаў у ім гусей. Што было раней, не ўдаецца мне даведацца, бо мая інфарматарка гаворыць, што не надта ведае, хто і што там рабіў. Гэтаксама і пра будынак былой школы — гэта той, згаданы раней хорам у пачатку вёскі...

Навучанне ў гуранскай школе закончылася каля васемнаццаці гадоў таму. І доўгі час будынак пуставаў і нішчэў, ніхто ім не цікавіўся. Але вось нядаўна, два-тры гады таму, купіў яго беластоцкі патомак выхадцаў з непадалёкіх Плябанаўцаў, які ў Гуранах мае сваякоў. А жыхары вёскі не ведаюць, што ён там робіць за пільнаваным сабакамі шчыльным плотам. Сабак корміць ён сам, прыязджаючы кожны другі дзень з Беластока.

У Гуранах трое дзяцей дашкольнага ўзросту. Ёсць і двое школьнікаў, дзяцей крыноцкага пісьманосца, які іх возіць у школу едучы на працу; школьны аўтобус пакуль у Гураны не мае патрэбы курсіраваць.

Ёсць крыху адзінокіх мужчын, што ўпору не пажаніліся. Цяпер ім больш за сорак і жывуць яны каля крамы за бацькоўскія пенсіі. Крама ў Гуранах асталася; раней яна была ўласнасцю геэсу, але цяпер яна прыватная. І жыхары Гуран дбаюць, каб крама была ў іхняй вёсцы, не купляюць у аб'язных прадаўцоў і яны нават перасталі ў Гураны ездзіць. Калі свая крама пастаянна адкрыта, то калі сабе захочаш, тады пойдзеш і купіш што трэба...

Падаюся ў бок крамы, яна менш яркая за самую вёску. Мужчына, што выхіліўся з-за яе, запрашае мяне ў сваю кампанію, што ззаду крамы. Выбар тавару на паліцах невялікі, акурат такі, які патрэбны яе карыстальнікам — пажылым вяскоўцам. Запрашэннем у кампанію вясковага актыву не карыстаюся, хаця за крамай весела; чуваць адтуль не толькі найшчырэйшыя размовы — ёсць і смех, і квікі...

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Кляшчэлеўскія інвестыцыі

Кляшчэлеўская гміна разам з мястэчкам налічвае пятнаццаць салэцтваў. Сёлетні бюджэт гміны складае каля пяці з паловай мільёна злотаў, прычым тры з паловай млн зл. гміна атрымае з уласных прыбыткаў. Нягледзячы на абмежаванне фінансавых сродкаў, кляшчэлеўскі самаўрад прызначыў 1 733 тыс. зл. на інвестыцыі і рэалізуе пяць еўрасаюзных праектаў. Асноўная інвестыцыя, якая будзе рэалізавацца ў трох этапах, гэта ўрэгуляванне водасцёкавай гаспадаркі. У рамках гэтага праекта будуць пабудаваны санітарныя калектары ў Дабрывадзе і ў Кляшчэлях пры вуліцах Дабрывадскай і Касцельнай з адначасовай пракладкай азбеставых трубаў. Кошт інвестыцыі ацэньваецца на дзесяць мільёнаў зл., прычым у першым этапе будзе выкарыстаных 3 мільёны зл. У рамках той жа праграмы быў рэалізаваны праект мадэрнізацыі гміннай дарогі Кляшчэлі — Рэпчычы за суму 780 тыс. зл. (пракладка асфальтавага палатна). Паводле праграмы „Аднаўленне вёскі ды захаванне і ахова культурнай спадчыны" на ўчастку старой школы будзе пабудаваны культурна-адукацыйны турыстычны цэнтр „Гладышка традыцыі". Кошт інвестыцыі — 635 тыс. зл. У рамках аперацыйнай праграмы рэгіянальнага развіцця мадэрнізаваны дзве гмінныя дарогі на адрэзку Сакі — Залешаны за суму 340 тыс. зл. У рамках праекта „Маладыя адкрывальнікі прыгранічных шляхоў" (праграма Phare 2003) Кляшчэлеўская гміна наладзіла супрацоўніцтва з горадам Высокае на Беларусі. Па запрашэнні мясцовага самаўрада ў сакавіку г.г. у Кляшчэлях гасцявала дэлегацыя з Высокага, а ў траўні прадстаўнікі гміны паехалі на Беларусь з рэвізітам. Незалежна ад пяці рэалізаваных праектаў адабрэння чакае шостая заява, якая тычыцца праекта „Маладыя адкрывальнікі прыгранічных шляхоў", ад якога засталіся нявыкарыстаныя грошы і якія мяркуецца выкарыстаць на рамонт вясковых клубаў у Дабрывадзе ды Палічнай. Кошт рамонту складзе суму 400 тыс. зл. На 2007-2013 гады гміна распрацоўвае праект „Турызм і адпачынак над Рэпчыцкім вадасховішчам". У яго рамках прадугледжана пабудова мола, пешых і веласіпедных сцежак, стаянак для аўтамабіляў, пракладка водаправодаў і каналізацыі да дачных участкаў. Будзе працягвацца мадэрнізацыя гмінных дарог (пракладка асфальтавага палатна) на адрэзках: Пагрэбы — Жукі (2 км), Пагрэбы — Косьна (1 км), у вёсках Пятроўшчына і Курашава, адрэзак дарогі Залешаны — Равы, Залешаны — Тапаркі, Дабрывада — Рэпчычы, як і дзве вуліцы ў Кляшчэлях: Галоўная і Касцельная. Праекты будуць падрыхтаваны да канца лістапада, а ў снежні гміна пашле заявы. Варта адзначыць, што дагэтуль не была вернута ніводная заява. Кляшчэлеўскія гмінныя чыноўнікі гэта прафесіяналы па афармлянні еўрасаюзных дакументаў і заяў. Дзякуючы гэтаму гміна можа пакарыстацца еўрасаюзнымі сродкамі і рэалізаваць шматлікія інвестыцыі пры сваім сціплым бюджэце.

(ус)

Помнік даўніны

У Клюковічах даўней была сядзіба гміны, пастарунак міліцыі, пошта і пачатковая школа. Гэтую апошнюю збудавалі ў міжваенны перыяд, а разбудавалі пры камуне. У час трансфарма-

цыі школу, на жаль, ліквідавалі, бо замала было вучняў. Зараз дзеткі з Клюкавіч вучацца ў Пачатковай школе ў Сяміхочах, а гімназісты — у Нурцы-Станцыі. У даўнейшай школе засталася адно бібліятэка, дзе раз у тыдзень можна абмяняць кніжкі. Большасць памяшканняў нявыкарыстаная. А калісьці бурліла тут жыццё. У пачатках шасцідзесятых гадоў школе было прысвоена імя Ежы Бурыча, аб чым сведчыць мемарыяльная дошка на будынку: „W tej wsi żył i pracował Jerzy Burycz syn Bazylego ur. w 1900 r. Sekretarz Komitetu Polskiej Partii Robotniczej w Klukowiczach. Zginął w dniu 21.08.1946 r. na posterunku pracy partyjnej z rąk reakcyjnego podziemia. W 20 rocznicę powstania Polskiej Partii Robotniczej społeczeństwo pow. Siemiatyckiego".

Мінулыя будні, як і мемарыяльную дошку я лічу помнікам даўніны. Гэта ўжо гісторыя.

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

Сучасны аддзел

27 кастрычніка г.г. у Гайнаўцы па вул. Ліпавай 190 здалі ў карыстанне сучасны камфартабельны шпітальны інфекцыйны аддзел на 21 месца. Займае ён плошчу ў 800 квадратных метраў. Ён дастасаваны для інвалідаў. Кантакт хворага з наведвальнікам можа адбывацца пры дапамозе аўдыёвідэаапаратуры.

Кошт інвестыцыі — 2,4 млн злотых, а прафінансавалі яе павятовае староства, Гайнаўская гарадская управа, а таксама еўрасаюзныя фонды.

(мох)

У Гайнаўскай гміне

У Гайнаўскай гміне пабудавалі шмат добрых, роўных і гладкіх дарог. У 2007-2008 гадах будзе яшчэ больш дарог пакрытых асфальтам. Асфальт паложаць на вуліцах у вёсках Скрыплева і Сарочая Ножка ды на новым жыллёвым пасёлку ў Дубінах, а таксама ў прысёлках вёскі Арэшкава. Лепшых маставых дачакаюць жыхары вёсак Хітрая, Дубічы-Асочныя і Махнатае на дарогах, якія іх спалучаюць. Па асфальтавай маставой будуць ездзіць усе на даволі доўгім адрэзку дарогі з вуліцы Дольнай у Гайнаўцы ў напрамку вёскі Новае Беразова.

(мох)

Ганна Кандрацюк (redakcja@niva.iig.pl)



зорка

для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

— 49 —

Усіх як з хаты вымела. Мама спачатку пайшла з татам і Гражынкай у царкву, а бабуля адразу перад пятай гадзінай раніцы пабегла ў камісію. Бо бабуля мае сядзець на выбарчым участку, сачыць за галасаваннем, а пасля да поўначы будзе лічыць галасы з іншымі членамі камісіі. Рыхтаваліся да ўсяго гэтага тыдні з два, ды ад пару дзён абавязвала выбарчая цішыня.

— Добра, што змоўклі ўрэшце, — прабурчэў Грак, прахаджваючыся па падлозе, бы той тата, калі пачне разважаць.

— Цаму змоўклі? — папытаўся Мікітка, выходзячы з туалета, атрэпваючы лапка аб лапку са жвірку. — Пляўда, ціха.

— Вось, бачыш. Гэта выбары. Гражынка яшчэ не выбірае. А выбіраць трэба.

— А сьто такое вібіляць?

— Сьто-сьто! Гэта так, калі мала што не прысутнічаеш пры пакупцы жвірку, а нават не намякнеш на тое, у якім хочаш... ісці на двор.

— Намяўкнеш? Мяне на дволь не пускаюць у такі досьць.

— Вось, і купяць жвірок, які не ўбірае ў сябе твае, прабач, Мікітка, пахі, або насыплюць табе ў туалет сырога пяску. І тады вазьмі ты захавай прыстойнасць.

— Фе-е-е... — развесіў язычок Мікітка, уявіўшы жоўты калючы пясок пад хвосцікам. — А мне купілі такі, сьто пахне ялінкай. Я і казяў Глязінці, сьто мне такі падабаеця.

— „Падабаеця!" Трэба патрабаваць: „Мне трэба так ды гэтак. Жыву з вамі, дык маеце са мною лічыцца. Маю свае правы!" А не — дык выберу сабе іншых!

Мікітка вылупіў свае круглыя вочы на Грака, ахопленага выбарчым палам. Грак аж падскочыў, ды зараз і крылы апусціў.

— А ты цяго хо-о-оцясь? А мяне, Мікітку, самога выблялі. Мне тут добля.

— Ніхто тут цябе не выбіраў, толькі прывёў цябе сюды твой татка. Ну, выбраў ён нашу сям'ю для цябе. Але калі б не бабуля... Ну, і я паляцеў бы, калі б мне тут было блага.

— Ну, дык быў гэта ўзаемны выбар-р-р-р! — раптам завуркатала ў Мікітку як у вялікім каце.

Міра ЛУКША

СЯБРЫ З ГАЙНАЎКІ

Фота Ганны Кандрацюк

Пяцікласнікі з ПШ н-р 6 з настаўніцамі

Пазнаем алфавіт

Літара „Г"

Аднаго разу мама сказала Міколку і Васільку:

— Хлопчыкі, я прыдумала цікавую гульню. Яна называецца «Дапішы літару „Г"».

— Чаму яе трэба дапісваць? — пытаецца Васілёк.

— Такая гульня. Спярша пішам якое-небудзь слова, а пасля дапісваем літару „Г", каб атрымалася новае слова. — Мама ўзяла ручку і напісала на аркушы паперы слова „сто".

— „Сто" — гэта лічба? — шмаргануў носам Міколка.

— Але, — кіўнула галавою мама і да гэтага слова хуценька дапісала літару „Г".

— Мама, у цябе атрымалася новае слова — стог! — усклікнуў Міколка.

— І вы пастарайцеся прыдумаць. Калі вельмі-вельмі пастараецеся, то і ў вас атрымаецца новае слова. Літара „Г" вам дапаможа.

Мама выйшла з пакоя, а Міколка і Васілёк селі за стол.

— Давай напішам слова „Бе", — прапанаваў Міколка.

малюнак: Аня Бачынская і Моніка Якімюк з Чыжоў

— А хіба ёсць такое? — пачухаў патыліцу Васілёк.

— Ёсць, — упэўнена прагаварыў Міколка. — Так авечка крычыць. — І, каб даказаць Васільку, працягла вымавіў: — Бе-е-э...

— Пішы, — сказаў Васілёк.

Міколка старанна вавеў: Бе. А пасля: Бег.

— Ура! — узрадаваўся Васілёк. — У нас новае слова атрымалася. Было „Бе", а стала „Бег".

Зноў сядзяць, думаюць. Надакучыла думаць.

— Напішы „Ро", а пасля „Рог", — прапанаваў Васілёк Міколку.

Напісаў Міколка, а затым яны яшчэ так прыдумалі: Але — Алег, Ланцу — Ланцуг.

Прыйшла мама, пацікавілася:

— Дзеткі, дапамагла вам літара „Г" новыя словы напісаць?

— Дапамагла! — у адзін голас усклікнулі Міколка і Васілёк.

Зірнула мама на гэтыя словы, галавою паківала, нахмурылася.

Ці заўважылі вы, якія памылкі зрабілі Міколка і Васілёк?

(працяг будзе)

Аляксей ЯКІМОВІЧ

„Займальны алфавіт"

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

— (6) —

Два тыдні таму, у сераду, дзяўчаты з нашага класа закончылі ўрокі раней чым хлопцы. Калі мы з Ганкай, Касяй і Соняй выйшлі са школы, я ўсведаміла сабе, што мая куртка асталася ў школе. Я вярнулася ў распраналку, надзела куртку і ўжо мела ісці... Але... У куточку я пабачыла штосьці, што вельмі нагадвала камізэльку Ганкі, якую яна насіла ў пачатковай школе. Я ўзяла яе з сабой і аддала сяброўцы. Тая нават не глянула на старую апранаху, толькі ўкінула яе ў сумку, затым мы развіталіся і кожная пайшла ў свой бок.

На другі дзень наш клас наведала спадарыня Воўк. Яна мела загадкавы воблік.

— Увага! — сказала яна суровым тонам. — Вучню вашага класа прапала камізэлька. Ці можа хто з вас яе бачыў?

Усе запярэчылі.

— Глядзіце, — цягнула Воўк, — я і так знайду злодзея. Лепш каб ён адразу прызнаўся да гэтага ганебнага ўчынку. Тады і кара будзе лягчэйшая!

Усе ў класе маўчалі. Воўк абкінула нас крывым зрокам і выйшла. Мы адразу пачалі перашэптвацца, дапытвацца ў чым справа. Каму прапала камізэлька? Усе пыталі ўсіх наўкола, але ніхто пра нішто не ведаў. На гэты раз наш Міколка справіўся „на плюс", ён першы знайшоў ахвяру. Вось, дзякуючы нашаму жуліку, мы даведаліся, што камізэльку ўкралі Сяргею. Мы спачатку смяяліся і жартавалі з разяваватага Сяргея. Але жарты хутка скончыліся. Ужо пасля ўрокаў пані Міся, мама Сяргея, стала тэлефанаваць бацькам Міколкі, Ігара і Паўла. Яна наракала, што ў класе крадуць вопратку. Бацькі вельмі сур'ёзна ўспрынялі яе скаргу, пасля нават вялі допыты і следства. Ніхто не прызнаўся да віны, хоць кожны з хлопцаў атрымаў кару. Ім забаранілі чыпець „на асьцы" ды іграць у „Тыбю". Хлопцам сапраўды было крыўдна, яны нічога дрэннага не зрабілі...

Цягам двух тыдняў камізэлька не знайшлася. Усе ўжо пра яе забыліся, у кожнага з нас свае праблемы.

І вось, сёння, Ганка прыйшла ў школу з дзіўнай мінай. Мы не ведалі што сталася, але сяброўка адразу ўсё расказала.

— Учора вечарам я прыбіраю ў шафе, бачу, а там вісіць тая няшчасная камізэлька! Ад уражання аж прысела! Я не ведаю як яна там апынулася. Нехта падкінуў мне свінню — ці як?

Мы памаўчалі, а пасля я, Кася і Соня сталі смяяцца. Я мігам прыдумала рэканструкцыю гэтай злачыннай дзеі.

— А памятаеш як аднойчы я знайшла нейкую апранаху ў распраналцы?

— Божачкі! — пачырванела Ганка. — Я тады нават не паглядзела, што прынесла дахаты.

Пасля, калі нікога не было на калідоры, мы пакінулі Сярожкаву камізэльку ля століка цёткі-прыбіральшчыцы. Яна адна ведае як вырашыць справу і не пашкодзіць вучню.

Мы крыху баяліся прасіць прабачэння ў Сяргея. А раптам, — думалі, — пані Міся стане званіць нашым бацькам і абзываць нас зладзейкамі? А тыя, у рамках кары, забароняць нам карыстацца камп'ютэрам?!

Тэкст:<Natasza9922@wp.pl>
малюнкі:<lolcia05@tlen.pl

Галерэя „Зоркі" (Бельск-Падляшскі)

Эвеліна Бжазоўская

Сярэдняя ацэнка на пасведчанні: 6,0.

Твая мянушка: У дзіцячым садзіку звалі мяне „Бярозка", а цяпер „Бяроза".

У жыцці хачу стаць, чаму: У жыцці хачу стаць ветэрынарам, бо вельмі люблю жывёл і хачу ім дапамагаць.

У сяброў цаню: У сяброў цаню пачуццё гумару, шчырасць і ветлівасць.

Не люблю: Я не люблю ілгуноў і людзей без пачуцця гумару. Таксама не люблю восені, бо тады на падворку шэра і непрыгожа.

Па-беларуску размаўляю з: Бабуляй і дзядулем, цёцяй Геняй, а найбольш на ўроках беларускай мовы з настаўніцай.

Мой любімы гурт: „In Grid", а з беларускіх — „Прымакі" і „Зорка".

Каля свайго дому пасаджу: Многа фруктовых дрэў і вельмі многа прыгожых, каляровых кветак.

Польска-беларуская крыжаванка № 47



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 43: Пяро, сок, то, грыўка, алфавіт, русалка, сёння, конка, адрас, арс. Града, порт, як, Ас, ар, голас, флёкс, ты, акно, роў, ванна, акр, карта, ас.

Узнагароды, кніжку „Дзяўчынка і хмарка" Міры Лукшы (з аўтографам), выйгралі: **Патрыцыя Якубюк, Адрыян Аўласюк, Уршуля Беразавец, Марта Каранецкая, Юліта Кананюк** з Нарвы, **Кася Капытка, Кася Саковіч, Анжаліка Сапяжынская** з Чыжоў. Віншуем!

З Гаркавіч у Савецкі Саюз выехала пасля вайны 36 сем'яў, а звыш шасцідзесяці засталося. Тыя, што выехалі, стараліся вярнуцца як найбліжэй — у Гродна, Баранавічы... Многія з іх, калі атрымалі савецкі „ўкол", кінуліся ў п'янства, змарнаваліся...

У БЯРОЗЫ І СОСНЫ

Гаркавічы, як мала якая вёска, запісаліся ў гісторыю. Адсюль паходзіў адзін з вядучых лідэраў Беларускай сялянска-работніцкай грамады, пасол у міжваенны польскі Сейм Павел Валошын. З гэтай вёскі бурна выйшаў у свет пазнейшы старшыня Вярхоўнага Савета БССР Сяргей Прытыцкі. Але сёння ў Гаркавічах складана вяртацца ў тую даўніну, якая вёску найбольш праславіла. Гаркавічы зараз вельмі апусцелі, мала хто ўжо ў іх варушыцца, час забраў сведкаў мінуўшчыны.

Ян Баравік, народжаны ў 1925 годзе, у сваёй вёсцы толькі летуе, на зіму забіраючыся ў Беласток. Аднак у канцы кастрычніка ён з жонкай яшчэ ў сваёй вясковай хаце. Ды і да згадвання пра мінуўшчыну адносіцца асцярожна:

— Трэба думаць пра будучыню, — кажа мне, — бо згадваць мінулае небяспечна. Яшчэ калі чалавек разумны, то ён аднясецца да яго з павагай, але ёсць жа такія людзі, што, узяўшыся за былое, могуць нарабіць бяды.

Я пагаджаюся з ім, бо ж на нашых вачах усё паяўляюцца героі, гатовыя раскапаць старыя косці, каб на іх месцы пакласці новыя.

— Вось і калісь, — працягвае мой суразмоўца, — з адным нашым суседам жылі мы ў згодзе. Праўда, у нас было крыху больш поля і калі прыйшлі саветы, палічылі нас кулакамі. І тады той сусед захапіў частку нашага агарода, на якім тата быў ужо пасеяў авёс. І ён на той авёс навазіў гною і пасадзіў бульбу. Тата яго пытае: „Што ты робіш, чаму займаеш наш агарод?" А ён адказвае: „Твой агарод у Сібіры!" І той сусед стаў касавурыцца і на іншых, адчуў сябе вельмі важным. А мы і сапраўды былі ўжо запісаны на ссылку. Але да гэтага не дайшло, прыйшлі немцы. І тады тата скасіў збожжа, што той сусед пасеяў на забраным нам участку. А мне тады ўжо семнаццаць было, я і кажу тату: „Яго трэба немцам удаць за тое, што ён нарабіў". А тата мне адказвае: „Не, сынок, ён нам нічога такога благога не ўчыніў. А немцы ж, ведаеш хіба, што з ім зрабілі б..." І сапраўды: што з таго было б? Асталася б адно варожасць, а так усё вярнулася ў ранейшае русло, як да савецкага эпізоду, зноў жылі мы не крыўдуючы. Пасля вайны адзін знаёмы з Сукавіч — ён быў здаравякам, дужым — расказваў мне як да яго прыйшлі саланіннікі, такія сабе: „Я ж іх мог узяць аднаго ў адну руку, а другога ў другую і ўкаючыць, стукнуўшы іх аб сябе. Але я іх не чапаў, яны нешта ўзялі і пайшлі. Ну, бо што каму было б з такой расправы?" Трэба ўмець уступіць, трэба шукаць кампрамісу, — дадае спадар Баравік.

Ды пасля вайны не толькі саланіннікі хадзілі. Былі тут упаўнаважаныя савецкія лейтэнанты Іван Іванавіч і Васіль Васільевіч, якія намаўлялі мясцовых на выезд у СССР, абяцаючы ім там залатыя горы. А ў Саколцы быў іх камандзір, палкоўнік Ільін, здаравяка, які хадзіў у чорным кажусе.

— Мая дзядзіна запісалася на выезд у Савецкі Саюз, — кажа спадар Баравік. — Прадала хату і за тыя грошы купіла карову; адна карова ў яе ўжо была. Ну і тыя дзве каровы і іншае дабро завезлі на поезд у Саколку. Дзядзіна яшчэ вярнулася ў вёску, а я з яе сынам начавалі ў вагоне, пільнуючы дабытак. Рана я падаіў тых кароў, больш вядра малака надаіў. Што з ім было рабіць? Паклікаў я байцоў, што былі з эшалонам, каб ім яго даць. Яны збегліся і за тое малако аж сварыліся, каб не па поўным кубку наліваць, каб усім хапіла. Адзін старэйшы салдат пытае мяне: „Куда едешь?" „У Расію", — адказваю. „А за что?" „Па сваёй волі", — кажу. „Почему?" — усё здзіўляецца ён. „Бо там лепш. Але гэта не я еду, толькі дзядзіна". „Скажи ей, когда она вернётся, чтобы она убиралась назад домой, бо в России всё разбито, пропадёт она от голода!" Калі яна вярнулася, я ёй гэта сказаў. Яна сказала пра гэта іншаму эмігранту, ён далажыў упаўнаважанаму, а той палкоўніку Ільіну. Прыходзіць ён да мяне і пытае ці праўда гэта. Я адказаў, што праўда. „А ты его узнаешь?" — пытае Ільін мяне. „Узнаю", — адказваю. „Пойдём!" — загадаў ён. А я ўжо скеміў, што тут рыхтуецца. Прайшлі па эшалоне, той салдат сядзеў, апусціўшы галаву, я нічога не сказаў і віноўнага не выкрылі. А Ільін сказаў: „Это был враг Советского Союза!" Калі дзядзіна заехала на станцыю Ізюм каля Растова і разгрузілася, то за першую ноч ёй усё расцягнулі, апрача кароў. І яна тады прыклала ўсе сілы, каб вярнуцца адтуль; удалося ёй пераехаць у Баранавіцкую вобласць.

З Гаркавіч у Савецкі Саюз выехала пасля вайны 36 сем'яў, а звыш шасцідзесяці засталося. Тыя, што выехалі, стараліся вярнуцца як найбліжэй — у Гродна, Баранавічы... Многія з іх, калі атрымалі савецкі „ўкол", кінуліся ў п'янства, змарнаваліся.

А ў Гаркавічы з Усходу прыехала каля дзесяці сем'яў, з недалёк яны былі: з Гродна, Скідаля, Дзіневіч, Азяран, Парэчча... Яны ўжо ўсе пакінулі Гаркавічы, ніхто з іх не астаўся.

Пытаю спадара Баравіка пра Юраўляны, пра якія чуў я, што саветы сілай перасялілі ўсіх жыхароў вёскі да сябе...

— Гаварылі, што калі юраўляне даведаліся, што астануцца пад Польшчай, то двух з іх паехала ў Маскву прасіць, каб іх вёску аставіць пад Савецкім Саюзам. Масква граніцы не перамясціла, затое задаволіла іх просьбу іншым чынам, забіраючы ўсіх жыхароў на сваю тэрыторыю. Атрымалі яны жыллё зараз за граніцай, а на іх месца ў царкоўныя Юраўляны перасяліліся каталіцкія жыхары тых недалёкіх вёсак, якія асталіся на ўсход ад граніцы...

Згаданыя раней саланіннікі ў Савецкі Саюз не выганялі, рабавалі толькі. Яны пільна сачылі, хто што прадаў і пасля патрабавалі грошай. Вось і цесць майго суразмоўцы павёз свінчо прадаваць. Калі вярнуўся, на ягоны панадворак завіталі аматары лёгкага заробку:

— Ты вепрука прадаў... — прывіталіся.

— Не, не прадаў, назад прывёз.

— Пакажы!

А той парсюк яшчэ звязаны каля воза ляжаў. Але „госці" пацікавіліся іншым:

— А хто яшчэ што прадаў? — спыталі.

А тады і спадар Баравік жаробку з ялаўкай прадаў і за іх жняярку купіў. Зайшлі „госці" на падворак, пабачылі новую машыну:

— O, cholera, zdążył... — расчараваліся.

Аднак няпрошаныя госці рэдка заглядалі ў Гаркавічы, бо вёска была добра арганізаваная і яны пабойваліся.

Спадар Баравік добра ўспамінае ранейшы час, асабліва германскую эпоху, калі дзяржава купляла ад сялян усе іх прадукты. І крыху тлумачыць мне, чаму цяпер на ўсходзе не хочуць браць польскай сельскагаспадарчай вытворчасці:

— Калі ў сямідзесятых гадах саветы куплялі ў нас многа бульбы, нехта ў Янаўскай гміне ў мяшок з бульбай загарнуў здохлага сабаку. Атрымальнікі жартавалі, што даслалі ім „картошку з засмажкай"...

Ад спадара Баравіка кіруюся яшчэ ў бок вясковай святліцы, дзе ёсць зала прысвечаная Сяргею Прытыцкаму. Ключы ад святліцы ў солтыса, чалавека таксама немаладога, які яшчэ трымае некалькі кароў; ягоны сусед абрабляе крыху зямлі...

Гаркавіцкая святліца была пабудавана пасля вайны. Цяпер будынак апусцелы, адна шыба выбіта. Са звязкі ключоў ад культурнай установы солтысу не ўдаецца знайсці таго, які адкрыў бы святлічныя дзверы; удаецца гэта мне. Але ўжо дзвярэй у залу памяці слаўнага рэвалюцыянера не ўдаецца нам адамкнуць; солтыс кажа, што ягоны сын іх адкрываў. Але даведваюся, што нічога асаблівага ў зале памяці няма: асталося толькі некалькі здымкаў... А ў галоўнай зале святліцы тры квадратныя „святліцовыя" сталы і некалькі крэслаў — тут ладзяцца вясковыя сходы.

Амаль насупраць святліцы, на другім баку вуліцы, стаіць прыгожа адноўлены будынак былой школы. Аднавілі яго паляўнічыя, якія часам прыязджаюць сюды па уік-эндах. Адзін з іх жыў тут цэлае лета. Побач будынка, за брамай з вуліцы, злучаныя дошкай два новыя крыжы: каталіцкі і праваслаўны...

Крыху далей бачу жывую гісторыю, рарытэт у наш час: селянін баранує палетак канём. Заходжу, заводжу размову з чалавекам, які непарушна пражыў побач бурных падзей апошняга шасцідзесяцігоддзя.

— Каня мушу трымаць, — кажа мне. — Вось, у жонкі ногі хворыя... З вёскі аўтобусам паедзе, а вярнуцца няма чым. Вось і трэба запрагаць каня ў воз і ехаць па яе...

З кургана за вёскай панарама старэйшых кустоў і зусім новых радкоў пасадак. Гаркавічы з новым стагоддзем уваходзяць у новую, мабыць, лясную, будучыню. Не трэба ўжо будзе вазіць нашых кулакоў у тайгу — яна сама да нас завітвае. Любімыя гаркавічанамі ідэолагі абяцалі настаўнікаў заміж паліцаяў; цяпер тут становяцца непатрэбнымі і адны, і другія. А паляўнічыя? Лес расце...

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Як абразы бачу перад вачыма (4)

(пачатак у 44 н-ры)

З **Івонкай СУРВІЛАЙ**, старшынёй Рады БНР, гутарыць Ганна КАНДРАЦЮК.

— У чым заключаецца актыўнасць Рады БНР?

— Мы стараемся прыцягнуць увагу свету да Беларусі. І не такую ўвагу як прыцягвае Лукашэнка ці Чарнобыль, дзе адны няшчасці. Мы стараемся паказаць свету, што Лукашэнка — гэта не Беларусь! Лукашэнка гэта дыктатар, які рэалізуе свае мэты, што гэтыя мэты абсалютна абыякавы да беларускасці, да нашай нацыі. Ён нішчыць усё беларускае, нішчыць мову, школу, культуру, закрыў Саюз беларускіх пісьменнікаў, Еўрапейскі гуманітарны універсітэт, беларускі ліцэй. Ён абвяшчае ўсім, хто хоча яго слухаць, што беларуская мова недастаткова добрая, што на ёй немагчыма ўсё выказаць. Значыцца, ён не прадстаўляе нашую нацыю.

— Цягам апошніх дзён Вы правялі рабочую сустрэчу ў Эстоніі. Якая там ставілася праблема?

— Першая праблема — гэта незалежнасць Беларусі. Важна, каб суседзі баранілі незалежнасць Беларусі, каб яны не прызналі саюзу Беларусі з Расіяй, каб не прызналі рэферэндумаў, ведаючы, што яны сфальшаваныя і не прадстаўляюць волі народа і, найважнейшае, каб не прызнавалі анексіі Беларусі Расіяй.

Другая праблема — гэта культура. У час сустрэчы з міністрам па справах нацыянальных меншасцей мы размаўлялі пра нішчэнне нашай культуры. Беларуская культура шмат дзе выжыла, дзякуючы нашай эміграцыі, замежжу. І мы якраз выступаем за тое, каб наша меншасць магла захаваць сваю культуру. Просім дапамогі для школ, у наладжванні абмену пісьменнікамі, арганізаванні мастацкіх выставак. Я асабіста прасіла, каб усе акцыі мелі медыйны рэзананс, каб справа не праводзілася сакрэтна, каб пра яе ведалі не адно беларусы Эстоніі, але каб інфармацыя ішла шырэй у свет, што наша культура развітая, што мы еўрапейскі народ і што мы мусім быць у Еўропе.

Фота Тацяны Казак

Міраслава Лукша дорыць Івонцы Сурвіле сваю кніжку

На маю думку, калі такія словы скажа міністр замежных спраў, яны могуць пазітыўна паўплываць на беларусаў, якія маюць тэндэнцыю падтрымоўваць Лукашэнку.

— Як у свеце ўспрымаюць прэзідэнта БНР?

— Часта нашу пазіцыю параўноўваюць з Далай-Ламай. У свеце добра разумеюць, што Далай-Лама быў вымушаны пакінуць Тыбет.

З другога боку, не заўсёды Далай-Ламу прымаюць з прыемнасцю, бо гэта мяшае ў афіцыйных суадносінах з Кітаем. У нас падобна. У многіх краінах баяцца, што вялікая публічная прыязнь да БНР можа папсаваць суадносіны з Лукашэнкам і Расіяй. У заходніх краінах нашы суадносіны больш дыскрэтныя, хоць не ўсюды. У Чэхіі, напрыклад, прынялі нас з адкрытымі рукамі. Мяне прымалі на найвышэйшым узроўні, я падпісвала кнігу прэзідэнтаў. Мела я таксама нагоду выступіць у англійскім парламенце, мяне запрасілі з нагоды прыняцця асацыяцыі Беларусь — Вялікабрытанія. Там была менш ясная пазіцыя, апрача мяне выступаў яшчэ беларускі амбасадар. У іншых краінах, напрыклад, у згаданай Эстоніі, я спатыкалася з міністрам замежных спраў. У Латвіі і ў Літве мы сустракаліся на трэцім узроўні, таму што лакальны сектар не паспеў падрыхтаваць візіту, усё афармлялася пару дзён да прыезду.

Для мяне важныя ўсе сустрэчы, з аднаго боку — дзеля пратакола, з другога — варта пагутарыць хоць бы з дарадчыкам міністра, бо такая размова таксама можа спрацаваць у карысць Беларусі.

— Яшчэ да прэзідэнцтва Вы былі старшынёй Канадскага фонду дапамогі ахвярам Чарнобыля ў Беларусі. Ці ў час выступленняў ставіце праблему Чарнобыля?

— Я, як старшыня Рады, у маіх візітах не гавару пра Чарнобыль. Свет вельмі добра ведае пра Чарнобыль. За 8 гадоў дзейнасці ў фондзе нам удалося паставіць Беларусь на ментальную карту канадцаў. Мы здабылі прыяцеляў для Беларусі як краіны знішчанай Чарнобылем.

У гэты момант нам ідзе паказаць Беларусь як еўрапейскую краіну, з развітай культурай, а не як беднага, малога брата.

— Вашае прозвішча прысутнае ў беларускім мастацтве. Як знаходзіце час і месца для творчасці?

— Ведаеце, мастацтва гэта нешта спецыфічнае, такое пакліканне, так як быць манахам. Яно цэлы час у сэрцы, у душы і цягне да яго ўвесь час. Напрыклад, калі чытаю тэкст пра мастацтва, дык ён сам уваходзіць у галаву. Не трэба старацца запамятаць як у іншых прадметах. Мастацтва — частка мяне, маёй істоты. Апошнія гады я тры гадзіны ў тыдзень прысвячаю мастацтву, каб зрабіць прынамсі адну акварэль. Між 1979 і 1986 гадамі я рабіла шмат графікі. Пасля 1986 года, пасля Чарнобыля, я адчула што мастацтва мяне пакінула. Яно стала нечым такім несур'ёзным, быццам гульнёй — у параўнанні да жыцця. Я перастала маляваць і 8 гадоў нічога не рабіла. Не магла. Я страшэнна перажыла Чарнобыль, для мяне гэта было быццам асабістым няшчасцем. Мне здавалася, што маё жыццё страціла сэнс. Ведаеце, усё жыццё мы з мужам змагаліся, каб Беларусь жыла. А тады мне здалося, што яны знішчылі Беларусь. Гэта быў вельмі цяжкі час у маім жыцці.

— Колькі ў Вас было выставак?

— Чатыры персанальныя і, мабыць, з сорак калектыўных. Найбольш у Канадзе і ЗША.

— А ў Беларусі?

— Паказвалі, здаецца, адну ці дзве гравюры. Але я спадзяюся, што выстава яшчэ адбудзецца.

(працяг будзе)

Драгічын заглыблены ва ўспамінах

Ля Замкавай гары ў Драгічыне хвалі Буга ўжо многія стагоддзі лашчаць валуны-камяні. Кожная веснавая паводка або летні навальнічны лівень адкусвае кавалкі Замкавай гары і топіць іх у бяздонні ракі.

Сёння Драгічын дрэмле, заглыблены ва ўспамінах аб сваёй колішняй велічы. Нездарма славутая драгічынская гара мае назву Замкавай. Здаўна яна была непрыступнай крэпасцю, а вакол яе знаходзіліся шматлікія паселішчы. У крэпасці ўзвышаліся княжацкія харомы. Зараз толькі пліткі з карычневай паліваю, кавалкі ружовага сланцу ды асколкі колішніх кафляў, параскіданых па бугскім беразе, сведчаць аб іх багатым убранстве.

Археолагі мяркуюць, што драгічынская крэпасць і паселішчы ўзніклі ў VII стагоддзі. Знойдзеныя ў пахавальных курганах прадметы сведчаць, што насялялі яго дрыгавічы з прымессю мазаўшан. Гэта быў адзін са значных цэнтраў Кіеўскай Русі, росквіт якога наступіў у XI стагоддзі.

Знойдзеныя рэшткі печаў ды вялікая колькасць жужалю сведчаць аб тым, што былі тут развіты плаўка жалеза і кавальскае рамяство. Драгічынскія майстры славіліся таксама сваімі вырабамі з рогу (масавы выраб грабянёў). Ганчарні ў Драгічыне выраблялі збаны, талеркі, міскі, кубкі, чаркі. Гэтым формам начыння ўласцівы характэрны арнамент, шматлікія знакі, сярод якіх і знак двухзубца Рурыкавічаў.

У раннім сярэдневякоўі Драгічын быў важным гандлёвым цэнтрам. Знойдзены тут былі алавяныя пломбы з рознымі знакамі: літарамі кірылаўскага алфавіту, геаметрычнымі і раслінными арнаментамі, выявамі людзей і жывёлы. Імі былі пазначаны тавары, якія паступалі ў Драгічын з далёкіх гарадоў. Не абміналі яго купцы з далёкай Бухары, пакідаючы тут сярэбраныя дырхемы. А пра гандаль з Венецыяй і Візантыяй сведчаць венецыянскія значкі і візантыйскія крыжы.

З хронік даведваемся, што на працягу XII-XIII стагоддзяў быў ён зборным пунктам для дружын рускіх і польскіх князёў у іх паходах супроць ваяўнічых яцвягаў.

У 1240 годзе Драгічын падвергся знішчэнням ад нашэсця татараў, але ў хуткім часе аднавіўся. У 1380 годзе яго разбурылі крыжакі.

Калі ж у 1520 годзе было створана Падляшскае ваяводства, Драгічын стаў яго сталіцай і на перыяд XVI-XVII стагоддзяў прыходзіцца найбольшы яго росквіт. Але ў 1657 годзе яго здабываюць шведы, а потым венгерскія войскі Ракочы. У выніку гэтага ад замка і горада не засталося каменя на камені і ад таго часу Драгічын заняпаў і ператварыўся ў забытае мястэчка.

Пажары і дзве сусветныя вайны не абышлі яго. Толькі стромкія вежы старажытных касцёлаў і царквы ды напалову размытая Бугам легендарная Замкавая гара сведчаць аб яго колішняй велічы.

Адкуль узялася назва „Драгічын"? Выказванні гісторыкаў розныя. Гучанне назвы мясцовасці рускае і, мабыць, вядзе сваю радаслоўную ад імя Драгіта, у далейшым ператворанае на Драгічын. Некаторыя прыпісваюць заснаванне горада князю Яраславу Уладзіміравічу. Усё аднак губляецца ў імгле недаследаванай гісторыі. Першыя ўпамінанні паходзяць з рускіх хронік 1038, 1061 і 1148 гадоў. У 1251 годзе Даніла Раманавіч, супольна з рыцарствам рускіх князёў, перамог яцвягаў і заваяваў Драгічын (старажытная назва Дарагічын). Атрымаў ён карону ад рымскага папы Інакенція IV і быў каранаваны 8 жніўня 1254 года ў Драгічыне як адзіны ў гісторыі кароль Русі.

(мох)

http://www.wrotapodlasia.pl/by

Нацыянальная палітыка Еўрасаюза пакрысе дае свае станоўчыя вынікі. І тычыцца гэта не толькі краін так званай старой Еўропы, але і найноўшых членаў аб'яднанай еўрапейскай супольнасці, у прыватнасці, Польшчы. Сучасныя парадкі, што ўсталёўваюцца Бруселем, патрабуюць больш паважлівых адносін да нацыянальных меншасцей. У выніку на дарогах з'яўляюцца ўказальнікі з назвамі „па-мясцоваму", чыноўнікі мясцовага самакіравання прымушаюцца да вывучэння мовы той ці іншай нацыянальнай меншасці, а ў Інтэрнэце пачынаюць працаваць сайты, якія прадстаўляюць адпаведны рэгіён і маюць шмат розных моўных версій. Гэтым мясцовая ўлада „забівае двух зайцоў" — паважліва ставіцца да тутэйшых нацыянальных меншасцей і даносіць інфармацыю аб сваім рэгіёне на мове суседзяў. Яскравым прыкладам дасягнення такіх мэтаў з'яўляецца сайт, які прэзентуе Падляшскае ваяводства — „Вароты Падляшша".

Адрас беларускай версіі сайта http://www.wrotapodlasia.pl/be. Зразумела, што галоўная мова партала — польская. На яе трапляеш з некаторых яго рубрык, якія не маюць іншамоўных версій. Але гэта не галоўнае. Галоўнае тое, што па-беларуску даведацца аб Беластоку і ягоных ваколіцах, грамадскім і эканамічным жыцці рэгіёна могуць людзі, да якіх не даходзяць „Ніва" ці „Czasopis".

Першая старонка беларускамоўнай версіі выглядае таксама як і польская. Уверсе фотакалаж мясцовага краявіду, дзе на першым плане выступаюць бусел і зубр — своеасаблівая прыродная візітная картачка Падляшша. З левага боку месцяцца выйсці на сем моўных версій. Кожная з іх пазначана сцяжком. Праўда, беларуская версія месціцца не пад бел-чырвона-белым нацыянальным, а пад чырвона-зялёным „лукашэнкаўскім" сцягам. Страшэннага ў тым нічога няма, але такая рыса ўказвае на тое, што ўсё ж такі сайт збольшага зарыентаваны на знешняга інтэрнэт-карыстальніка, які не жадае разбірацца ў беларускім канфлікце сімвалаў. Але тут узнікае пытанне: а навошта „чырвона-зялёным" беларусам беларускамоўная версія, бо яны ж выдатна разумеюць па-руску і да беларускай мовы ставяцца, па меншай меры, абыякава?

Маршалак Падляшскага ваяводства Януш Кшыжэўскі з першай старонкі сайта запрашае да супрацоўніцтва ўсіх, хто хоча ўвесці штосьці новае ў жыццё рэгіёна. „Мы маем надзею, — кажа ён, — што дзякуючы нашаму парталу, мы прадставім у аб'яднанай Еўропе наш рэгіён як рэгіён шырокіх магчымасцей, а нашыя госці прыедуць да нас яшчэ не адзін раз".

Галоўныя старонкі сайта — „Рэгіён", „Гаспадарка", „Турызм" і „Прыроднае асяроддзе". Падрабязна распавядаць пра ўсе рубрыкі, выйсці на якія, як мае быць, знаходзяцца з левага боку выяўлення, не выпадае, бо іх надта многа, а яшчэ больш падрубрык, насычаных вельмі цікавай і змястоўнай інфармацыяй аб ваяводстве. Там кожны зацікаўлены знойдзе дакладна пададзеныя, поўныя звесткі аб Падляшшы. Тэксты аздобленыя выдатнымі фотаздымкамі. Гэта ўказвае на тое, што распрацоўшчыкі сайта падышлі да віртуальнага расповеду аб сваёй малой радзіме з усёй адказнасцю, а мясцовая ўлада, відаць, насамрэч дбае аб прыцягненні замежных інвестыцый у сельскую гаспадарку, турызм, адукацыйныя праекты Падляшскага ваяводства.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Яркая канцоўка

Фінішаваў 16-ы чэмпіянат Беларусі па футболе. Канцоўка яго выдалася надзвычай цікавай і інтрыгуючай. За тур да заканчэння на золата прэтэндавалі барысаўскі БАТЭ і мінскае „Дынама", на бронзу — салігорскі „Шахцёр" і сталічны МТЗ. Пікантнасць сітуацыі была ў тым, што барысаўцы гулялі ў гасцях з леташнімі чэмпіёнамі — салігорцамі. БАТЭ задавальняла нават нічыя і каманда Ігара Крыушэнкі пасля першага тайма выйгравала 2:0. Але „Шахцёр" у другім тайме здзейсніў неверагоднае і перамог 3:2, забяспечыўшы сабе трэцяе месца. Лёс БАТЭ заставаўся ў руках мінчан, якія гулялі ў Брэсце з мясцовым „Дынама". Калі б сталічнае „Дынама" перамагало, то быў бы прызначаны дадатковы матч за чэмпіёнскі тытул. З-за моцнага снегу паядынак у Брэсце пачаўся на дзве гадзіны пазней. У выніку „брэсцкая крэпасць" (не выключана, што належна стымуляваная барысаўцамі — за грошы ганебна прайграваць, але не ганебна перамагаць, як калісьці заўважыў вядомы трэнер Людас Румбуціс) выстаяла — 0:0, а расчараванню мінчан не было мяжы. Прыкра і МТЗ — у апошнім туры ён з хакейным лікам разграміў на выездзе „Гомель" — 8:2, але з-за асабістых сустрэч з „Шахцёрам" застаўся за рысай прызёраў. Так што самаму ўдачліваму беларускаму клубнаму трэнеру Юрыю Пунтусу не ўдалося папоўніць сваю багатую медальную калекцыю. Дарэчы, гэта быў апошні матч МТЗ пад яго кіраваннем — пад ціскам розных структур і грамадскага меркавання Пунтус пакідае клуб і засяродзіцца толькі на працы з нацыянальнай дружынай.

Вось выніковае становішча ўсіх каманд: БАТЭ — 54 пункты; „Дынама" (Мінск) — 52; „Шахцёр" — 51; МТЗ — 51; „Гомель" — 42; „Лакаматыў" (Віцебск) — 38; „Нафтан" (Наваполацк) — 37; „Дарыда" (Мінскі раён) — 37; „Дынама" (Брэст) — 31; „Нёман" (Гродна) — 30; „Тарпеда" (Жодзіна) — 30; „Днепр" (Магілёў) — 23; „Лакаматыў" (Мінск) — 19; „Белшына" (Бабруйск) — 9. Дзве апошнія каманды пакідаюць вышэйшую лігу. Асабліва прыкра за традыцыі бабруйскага футбола. На памяці выпадкі, калі самабытныя клубы, пакінуўшы мацнейшы дывізіён, знікалі зусім ці апускаліся ў багну ажно другой лігі (рэчыцкі „Ведрыч", „Ліда", „Маладзечна"). У наступным сезоне ў эліце будуць гуляць футбольны клуб „Мінск" і „Смаргонь".

Нежартоўнае змаганне разгарэлася і паміж футбольнымі бамбардырамі. Урэшце тытул лепшага снайпера заваяваў Аляксандр Кліменка („Шахцёр") — 17 галоў. Дзіўна, што вострага форварда да гэтага часу нават не выклікалі ў галоўную каманду краіны. Канкурэнцыю Кліменку складалі Раман Васілюк („Гомель") — 14 галоў і Вячаслаў Глеб (МТЗ) — 12. А вось самым карысным гульцом чэмпіянату стаў Арцём Канцавы (МТЗ). На яго рахунку 21 бал (12 забітых мячоў плюс 9 пасоў). Менавіта ён атрымае адмысловы прыз газеты „Прессбол" і фірмы „Дайнова". Толькі на адзін пункт адстаў ад пераможцы Раман Васілюк, на тры — хаўбек МТЗ Алег Страхановіч, які займеў ад журналістаў найбольш высокі рэйтынг. А ў цэлым чэмпіянат прайшоў цікава, пра што сведчыць і рост гледачоў на трыбунах — у параўнанні з мінулым сезонам гэты паказчык вырас у сярэднім на 134 чалавек на кожнай гульні.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Чарговае падарожжа ў Беларусь

Часта прыходзіцца мне падарожнічаць у суседнюю Беларусь. Найбольш карыстаюся дарожным пераходам Полаўцы — Пяшчатка. Апошнім часам прыкмеціў я тут невялічкія перамены. Раней праехаць праз пляцоўку было складана. У чарзе трэба было стаяць па дзесяць-пятнаццаць гадзін, паколькі шмат машын пад'язджала збоку. Тычыцца гэта, разумеецца, грамадзян Беларусі, хоць такіх хітруноў і сярод палякаў хоць адбаўляй. Добрасумленныя шафёры крыўдавалі па гэтай прычыне, але паталагічную з'яву не маглі рашыць. Зараз для чаргі аўтамабіляў на пляцоўцы адведзена месца, якое з абодвух бакоў абведзенае адмысловай жалезнай балюстрадай. Цяпер заехаць у чаргу збоку немагчыма ды і шафёры на гэта не дазваляюць. Праблема нечарговых праездаў у Пяшчатцы зараз стала больш прыемлівай, хоць канчаткова не вырашылася. Апошнім разам пакарыстаўся я пагранічным пераходам Полаўцы — Пяшчатка вечарам 8 лістапада. Тады з польскага боку ў чарзе стаяла некалькі дзесяткаў аўтамабіляў, што практычна абазначала каля трох-чатырох гадзін чакання, калі на беларускім баку не было чаргі ўвогуле.

Будынак чыгуначнай станцыі ў Высока-Літоўску

Варта ўспомніць аб двух яшчэ важных пераменах, якія тычацца польскіх турыстаў. Раней шафёр кожны раз абавязаны быў запаўняць дэкларацыю на аўтамабіль. Зараз закон адмянілі і такую дэкларацыю запаўняюць цяпер раз на тры месяцы. Але ўвялі правіла, якое забавязвае польскіх грамадзян запаўняць бланкі, у якія заносяцца нумары пашпарта і візы ды прозвішча асобы да якой едзеш і мэта паездкі. Расцягваецца пры гэтым час пашпартна-мытнага кантролю. Абагульняючы вышэйсказанае можна меркаваць, што ў зімовы час хутчэй можна будзе праехаць праз пагранпераход Полаўцы — Пяшчатка. Чэргі з беларускага боку ўменшваюцца, паколькі закончыліся работы ў полі і абмежавалася колькасць кліентаў на салярку.

На ўвагу заслугоўвае факт, што і на станцыі Высока-Літоўск прыкмеціў я перамены. На пляцоўцы побач вакзала паклалі асфальт. Будынак станцыі аднавілі і цяпер выглядае ён шыкарна.

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

З БЕЛАРУСКІМ РЭПЕРТУАРАМ

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Вучні Падставовай школы н-р 3 многа напрацаваліся над абрадам „Хрысцінаў”

Многа дзетак, моладзі і старэйшых гайнавян сабралася 5 лістапада на „Мастацкіх сустрэчах школьнікаў”, якія традыцыйна праходзілі ў Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы. У час мерапрыемства, якое ад некалькіх гадоў ладзяць Комплекс школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы і Аб’яднанне „Музей і асяродак беларускай культуры”, гарадскія вучні выступілі на беларускай мове з прадстаўленнямі, дэкламацыяй і песнямі. Школьнае спатканне папярэдзіў „Бульбафэст”, адтэрмінаваны з-за жалобы пасля смерці будаўніка музея Канстанціна Майсені. Сабраныя маглі спраўдзіць свае ўмеласці ў час падрыхтоўкі бульбяных страў і паспрабаваць выкананыя загадзя вырабы з бульбы, а перад публікай, у асноўным маладой, выступілі калектывы з фальклорнымі песнямі.

— Мы паказваем рэпертуар, з якім вучні дабіліся поспехаў на беларускамоўных конкурсах, для іх сямейнікаў і шырэйшай гайнаўскай публікі. Адначасна звяртаем увагу на вялікую пазаўрочную работу, якую выконваюць настаўнікі беларускай мовы і музыкі, рыхтуючы дзетак і моладзь да разнародных аглядаў і конкурсаў, — заявіў настаўнік беларускай мовы Гайнаўскага белліцэя Ян Карчэўскі, які вёў спатканне і рыхтаваў праграму мерапрыемства.

Выступленні школьнікаў распачаліся з абраду „Хрысцін”. Вучні Падставовай школы н-р 3 у Гайнаўцы моцна напрацаваліся рыхтуючы доўгую інсцэніроўку з выкарыстаннем даўніх вясковых прыладаў працы і старой вопраткі, якую раздабылі ў сваіх бабуль з падгайнаўскіх вёсак. Настаўніца беларускай мовы Марыя Крук заснавала ў школе рэгіянальны гурток, вучні якога ў мінулым годзе выступілі з абрадам „Вяселля”. Хрысцінная бяседа з прыказкамі, спевамі і танцамі папярэджана была старым абрадам, які спраўлялі ў доме бацькоў нованароджанага дзіцяці. Падрыхтоўка такой доўгай інсцэніроўкі праводзілася ў мінулым школьным годзе, а восенню вучні толькі дапрацавалі сваё выступленне. Першакласнікі з Гайнаўскай белгімназіі выступілі з кароткімі сцэнкамі, якія паспелі падрыхтаваць у час восеньскіх рэпетыцый і праспявалі песні з вучнёўскага рэпертуару.

— Гімназісты I „б” класа, якія сёння выступілі, ахвотныя вучыцца беларускай мове, але прыблізна трэцяя частка класа не вучылася гэтаму прадмету ў падставовай школе. Цяпер ім трэба вельмі моцна працаваць, каб навучыцца правільна пісаць па-беларуску і разумець тэксты. Я заахвочваю ўсіх тых, што хочуць вучыцца ў нашай школе, каб хадзілі на заняткі беларускай мовы яшчэ ў падставовых школах, — кажа настаўніца беларускай мовы Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы Вольга Сянкевіч, якая рыхтавала першакласнікаў да выступлення ў музеі.

З багатай праграмай выступілі вучні Падставовай школы н-р 6, якімі апякуецца настаўніца беларускай мовы Людміла Грыгарук. Моладзь пераапранутая ў сельскую вопратку паказала сцэнкі з колішняга вясковага жыцця. Публіку развесялілі дыялогі вучняў на тэму сучаснага вясковага жыцця. Відаць было, што дзяўчаты, якія ходзяць у школу па вуліцы Новаваршаўскай, добра ўмеюць гаварыць па-свойму. Вялікая ў гэтым заслуга не толькі бацькоў, але і бабуль ды дзядуляў з падгайнаўскіх вёсак. Гавораць яны да сваіх унучак на мясцовых дыялектах, якія можна было пачуць у час выступленняў.

— Мы любім ездзіць да сваіх бабуль, бо там можам пагаварыць з роднымі. На паддашках мы шукаем старых прылад працы. На сёлах ёсць таксама курачкі і свінкі, — канчаюць жартоўна свае выказванні Юстына Іванюк, Эвеліна Ракоўская і Дыяна Федарук з Падставовай школы н-р 6.

— На ўроках любім спяваць, рыхтаваць сцэнкі і займацца граматыкай, — дабаўляюць Ева Дземянюк і Наталля Сахарчук.

Моладзь з калектыву „Гіп-топ” Комплексу школ н-р 3, у склад якога ўваходзіць Падставовая школа н-р 6, выступіла з маладзёжнымі песнямі.

— Нашы вучні любяць спяваць беларускія песні і рыхтаваць пастаноўкі з матывамі з колішняга жыцця. Гімназісты цікавяцца вясковым жыццём у мінулым. Вучні другога класа збіралі весткі з гісторыі сёл іх продкаў, — кажа настаўніца ПШ н-р 6 Людміла Грыгарук і дадае, што вучні ахвотна ходзяць на заняткі роднай мовы (прыблізна трэцяя частка дзетак і моладзі), а пасля пад 90% іх ідзе вучыцца ў Гайнаўскі белліцэй.

Вучні з Комплексу школ н-р 2 з інтэграцыйнымі аддзяленнямі выступілі з песнямі і дэкламацыяй.

— У гэтым годзе мы не рыхтавалі пастановак, бо ў мінулым школьным годзе былі мы моцна заняты рэалізацыяй вялікага праекта „З традыцыяй у будучыню”, які абапіраўся на актыўным супрацоўніцтве з моладдзю з Рэспублікі Беларусь, — гавораць настаўніцы беларускай мовы Аліна Якімюк і Зофія Кердалевіч з Комплексу школ н-р 2. — У нас пад 70 дзетак вучыцца беларускай мове, сярод якіх большасць з падставовай школы. Нашыя самыя лепшыя вучні з падставовай школы найчасцей пазней ідуць вучыцца ў белгімназію і таму сярод нашых гімназістаў мала асоб ходзіць на заняткі роднай мовы. Аднак самае важнае, што нашы вучні вельмі ахвотныя працаваць па-за ўрокамі і рыхтавацца да разнародных беларускамоўных конкурсаў. Нават выпісваюцца з гурткоў па іншых прадметах, каб працаваць з беларускім рэпертуарам.

Вучні Падставовай школы н-р 5, якімі апякуецца настаўніца беларускай мовы Аліна Новік, удала падрыхтавалі дзве тэатральныя сцэнкі „Крыўда” ды „Каток і мышка”. Дзеткі з гэтай школы дэкламавалі таксама вершы і выступілі з апавяданнямі. За выступамі наймалодшых акцёраў сачылі іх бацькі і сямейнікі, якія, нягледзячы на снежную завею, прыйшлі на школьную сустрэчу.

Найстарэйшымі ўдзельнікамі „Мастацкіх сустрэч школьнікаў” былі белліцэісты. Вучні тэатральнага гуртка „Драма”, якім кіруе настаўнік Ян Карчэўскі, прадставілі п’есу „У нас уваходзіны”, з якой заваявалі першае месца на мінулагоднім конкурсе „Сцэнічнае слова”. Майстэрскае тэатральнае выступленне белліцэістаў і песні ў выкананні калектыву „Знічка” спадабаліся публіцы, якая засталася да канца мерапрыемства. Таксама ўдала выступілі белліцэісткі з паэзіяй і прозай. Настаўнікі беларускай мовы і музыкі, якія рыхтавалі дзетак і моладзь да беларускіх мерапрыемстваў, атрымалі ад арганізатараў музейнай сустрэчы дыпломы за грамадскую працу ў карысць развіцця сваёй культуры, якія ўручыў Ян Карчэўскі.

— Добра, што ладзяцца „Мастацкія сустрэчы школьнікаў”, бо мы, вучні, можам падтрымліваць беларускую культуру і паказаць шырокай публіцы тое, што робім у школах, — заяўляе белліцэістка Анна Раманюк, якая выступіла з вершам „Малітва”, з якім заняла першае месца ў Конкурсе рэлігійнай паэзіі.

„Бульбафэст” быў чацвёртым мерапрыемствам, наладжаным у гэтым годзе ў рамках цыкла „Культура на музейных сходах”. З фальклорнымі песнямі выступілі малодшы і старэйшы склад „Жэмэрвы” з Музея малой айчыны ў Студзіводах, якімі кіруюць Альжбета і Анна Фіёнік. Народныя песні прэзентаваў таксама калектыў з Нарвы, якім кіруе Анна Пятроўская. Пасля выступаў сабраныя спажывалі бульбяныя стравы, а адважныя самі рыхтавалі дранікі. Сустрэча гайнаўскай і бельскай моладзі закончылася экскурсіяй па музейных выстаўках.

Аляксей МАРОЗ

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Першакласнікі з белгімназіі за кастрычнік падрыхтавалі сцэнкі і песні

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп’ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2007 r. upływa 5 grudnia 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1683 egz.

Суседскія былі

ПАКУТЫ ТВОРЧАСЦІ

Сымон заўсёды лічыў сябе чалавекам сціплым. Нават больш сціплым, чым свежанькі нябожчык з сям'і інтэлігентаў у сёмым калене. Мабыць, большасць людзей планеты Зямля таксама залічваюць сябе ў неверагодна кароткі спіс сціплых людзей, пры гэтым публічна сцвярджаючы, што яны маюць абедзве важныя чалавечыя якасці — вялікую сціпласць і яшчэ большы розум. Але тое не пра Сымона. Гэны яшчэ ў школе, нават калі добра ведаў адказ на зададзенае пытанне, ніколі не падымаў руку, каб не дай Бог не палічылі яго выскачкам ці нахабнікам. Яго сціпласць ні хвіліны не драмала і пры неабходнасці, у змаганні з кволымі праявамі нахабства ў свайго гаспадара, клікала на дапамогу сумленне, сорам і ўсе іншыя праявы душы, якія лічыла сваімі хаўрыснікамі. Сымон быў перакананы, што гэтая якасць яго натуры, з задаткамі якой ён нарадзіўся на сваю бяду і якую паспяхова памножылі і ўмацавалі сярэдняя школа, прыгодніцкія кнігі, а асабліва бацькі, бо лічылі сціпласць гэткай жа абавязковай рысай чалавека як дыплом пра вышэйшую адукацыю ці насоўка ў левай кішэні пінжака, у многім яму перашкаджае рэалізоўваць задумы і планы. І ўсё адно мала калі адважваўся пахваліць сябе на людзях, нават калі гэта было неабходна для кар'еры. Але калі рэдактар яго першай кніжкі кінуў на стол перад носам Сымона дзесятак новенькіх экземпляраў, якія пахлі свежымі друкарскімі фарбамі, і на вокладцы якіх стаяла Сымонавы імя і прозвішча, нос сам палез угору, вышэй столі, а цёмныя сілы сталі бесперашкодна перапаўняць ужо безабароннае сэрца грахоўнай гордасцю за сябе любімага.

Сымон быў задаволены. Нарэшце яму ёсць чым даказаць, у першую чаргу сабе самому, а яшчэ ў пяршэйшую паказаць іншым, што яго жыццё праходзіць не так ужо марна і бессэнсоўна як можа падацца недасведчанаму воку. Непрыяцелі і зламыснікі цяперака заткнуцца як труба пад вадой, а прыяцелі павар'яцеюць ад шчасця і гонару за свайго знаёмага. Асабліва хацелася пахваліцца перад роднымі і сябрамі, аж у носе круціла як у сабакі пасля махоркі. Ён нават прадбачваў, як радня цэлы тыдзень стараецца дазваніцца яму, каб павіншаваць, але тэлефонная лінія занятая з-за перагрузак. Гэтак шмат людзей будуць дамагацца размовы з ім. А сябры і знаёмыя з гарэлкай ды закускай выстраяцца ў калону перад яго канторай, як жабракі за хлебам, каб набыць хоць адну кнігу на пяцёх з неўміручым аўтографам знаёмага аўтара, які вось-вось, неўзабаве, стане жывым класікам айчыннай прозы, ну і яшчэ каб выпіць з тым класікам кілішак добрага шатландскага віскара за яго творчыя поспехі.

Ну, а сям'я! На этапе абдумвання моманту прэзентацыі кнігі перад сям'ёй сілы антысціплавага лагера, якія яшчэ раней авалодалі сэрцам і розумам Сымона, акрамя ганарлівасці, пасяліўшы туды яшчэ пыху і самаўзвялічванне, пачалі дабірацца і да душы. У Сымона ажно спіна выпрасталася нібы дзіда ад уяўлення, якім урачыстым будзе з'яўленне вынікаў яго творчасці ў роднай хаце. Нарэшце яго жонка зразумее, што доўгімі вечарамі яе муж не займаецца, як яна думала дагэтуль, інтэнсіўным масавым паглынаннем піва ва ўсіх прыдарожных кнайпах, якія яму трапляюцца па дарозе з працы да хаты, не губляе час на пустыя размовы з такімі ж піякамі як сам, а рупліва і самааддана кладзе свае гадзіны і здароўе на ніву развіцця беларускай літаратурнай творчасці, гэтак патрэбнай нашчадкам і асабліва сучаснікам. Цяпер яна будзе ганарыцца сваім абраннікам і ніколі больш не асмеліцца спытацца: „Дзе ты, валацуга, зноў цягаўся да поўначы?", бо зразумее, што яе муж кожную вольную хвілінку прысвячае яе вялікасці Творчасці, а не нейкім там прыземленым жывёльным жаданням выпіць усё піва роднага горада і прылягаючых да яго тэрыторый. І хоць яно не зусім так, хоць гэтыя развагі не зусім праўда, але...

А што дзеці? Дзеці яшчэ больш заганарацца бацькам. Яны будуць хваліцца перад аднакласнікамі і цытаваць фразы з яго твора. Стануць яшчэ больш шанаваць і паважаць Сымона. Яны паставяць для сябе імя бацькі побач з Купалам, Коласам, Караткевічам, Адамовічам, Быкавым...

Вярнуўшыся недзе апоўначы, Сымон важнай хадой увайшоў у хату і ільвіным рыкам разбудзіў сям'ю. Сонныя дзеці і жонка незадаволена падпарадкаваліся загаду. Але па іх тварах было бачна, што калі прычына іх разбудзіць не такая ўжо важная, то з іх боку, на вінаватага ў парушэнні сну, не выключана атака з прымяненнем зубоў і кіпцюроў.

— Вось, калі ласка, мае кнігі, — з бліскучымі ад гонару вачамі прадэкларавў Сымон, сунуўшы кожнаму з сонных слухачоў па экземпляру. — Прама зараз налягаць на чытанне неабавязкова. Не спяшайцеся. Лепей дачакайцеся раніцы. На свежыя мазгі будзе лепш чытацца.

Жонка зяўнула, паглядзела на кнігу і паставіла яе на паліцу. Ляпкута. Там дзе звычайна стаяць кніжкі, якія або маюць кепскі выгляд, або якіх ніхто не збіраецца чытаць. Пасля салодка пацягнулася і, ні слова не сказаўшы, накіравалася ў спальню.

— Бацька, ты здурнеў, ці што? — вяла прабубнелі дзеці, таксама сунучыся да ложка. — Заўтра ў школу, а ты пабудзіў усіх сярод ночы. Ты ведаеш, якая цяжкая цяпер школьная праграма? Нам бы тое, што ў школе патрабуюць, здужаць. А кніжку гэтую нам у школе не задавалі. Няма калі нам на абы - што губляць час. Мы яшчэ па школьнай праграме „Людзі на балоце" не дачыталі.

Віктар САЗОНАЎ

Адгаданка

1. прозвішча першага касманаўта, 2. 60 штук, 3. да Кіева давядзе, 4. адміністрацыйная адзінка архірэя, 5. „вусатае" збожжа, 6. плывучая ледзяная гара, што адкалолася ад ледніка, 7. выбуховае рэчыва для зарадаў агнястрэльнай зброі.

(Ш)



Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — заўвага Рамона Гомеса дэ ла Серны.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 41 нумара

Вярба, афганец, метан, тэхнецый, час, баласт, чын, метал, валюта, кедр, змрок, Ош, лавіна, догма, двайнік.

Рашэнне: **Багацей гэта часта бедны чалавек з мноствам грошай.**

Кніжную ўзнагароду высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

19.11 – 25.11

Баран (21.03. — 19.04.) Высока ставіш перакладзінку! Не хапае табе чагосьці, чаго ў цябе няма; зварухнуцца амбіцыі. Будзеш круціцца ў асяроддзі, у якое хацеў бы ты трапіць; глядзі, каб не страціць пару сціплых, хоць не такіх „спрыяльных" асоб са старой кампаніі. Пачытай пару кніжак пра духовы развой.

Бык (20.04. — 20.05.) Жарсныя дні ў пары, а калі ты адзін, трапіцца табе інтэнсіўнае знаёмства з кімсьці вельмі прыцягальным. Пад канец тыдня магчымасць пабагацець!

Блізняты (21.05. — 21.06.) Заслужаныя поспехі. Не змагайся з абставінамі, на якія не маеш уплыву — здараюцца ж рэчы непрадказальныя і няўхільныя. Не хопіць часу, каб зрэалізаваць усё, за што ўзяўся.

Рак (22.06. — 22.07.) Не чакай манкі з неба; з касай крыху тугавата. Бесканфліктна, што не значыць што нудна, у спараваных Ракаў. Лепш не гуляй у сватку, бо поспех можа атрымацца адваротны. Старайся пааддаваць даўгі.

Леў (23.07. — 22.08.) Фантастычныя сустрэчы, якія памогуць табе забыцца на стрэсы. Магчымыя невялікія спрэчкі ў пары. Каб не трапіць у меланхалічны стан, часцей сустракайся з сябрамі.

Дзева (23.08. — 22.09.) Знакаміты час у суадносінах з найбліжэйшымі, гармонія. Пад канец тыдня зважай на ашуканцаў. Зашмат абавязкаў. Трапяць табе ў рукі кнігі аб развою і складанасцях душы — варта пацікавіцца.

Шалі (23.09. — 22.10.) Шанцы ў фінансах. Будзь адкрыты да людзей, не ацэньвай іх захутка. У пары справы набяруць шанцоўнасці. Шмат новых знаёмстваў; з кімсьці з новых знаёмых можаш пасля паехаць за мяжу.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Пацяплее клімат паміж табой і партнёрам. Добры настрой і фізічная спраўнасць. Адважна пераможаш усе выклікі лёсу. Няма нічога ні нікога такога, каб цябе напалохала!

Стралец (22.11. — 21.12.) З 20.11. у тваіх справах усё лепш. Да 24.11. усё паафармляй. 20.11. вернуцца ўсе справы, якімі мусіш заняцца; заплаціць за старыя памылкі, вярнуць несваё. 24.11. вызначыць новы этап твайго жыцця; адкрыюцца перад табою проста неверагодныя магчымасці!

Казярог (22.12. — 19.01.) Будзеш здольны да аграмаднага высілку; асягнеш кожную вызначаную мэту. Можаш спадзявацца толькі на грошы. Пазнаёмішся з цікавымі людзьмі толькі тады, калі вырвешся са свайго асяроддзя.

Вадалей (20.01. — 18.02.) З 23.11. (да 27.11.) магчымыя некарысныя суадносіны з людзьмі. Найлепш не дамаўляйся на любоўныя сустрэчы ў гэты час. Спакойна зарабляй грошы і ўздымайся па прыступках кар'еры.

Рыбы (19.02. — 20.03.) Цікавыя падарожжы, асабліва замежныя. Твае сакрэты нікога не ашарашаць — няма пагрозы ні для твае пазіцыі, ні для рэпутацыі. Не прыпамінай сябрам старых грашкоў. Калі не маеш працы, раптам можаш заснаваць фірму; поспех будзе перці за поспехам!

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960